Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

# Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Рукапісы, якія не прыдуцца, назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Замежны адрэс: іншагародняя — 20 к. мясцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шапкавай пасля тэксту — р. 50 к. За радок шапкавай пасляпрэ тэксту 1 р. — к. За радок шапкавай перад тэкстам 1 р. 50 к. Сыпешныя на 50 проц. даражэй. Знак тарыфу бярэцца 10 проц. шр.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумент — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумент — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газеты, на ўсіх аддзяленнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газеты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 47 (2536) Чацьвер, 28-га лютага 1929 г.

## За далейшы наступ на капіталістычныя элемэнты.

### Партыя не пацерпіць ваганьняў між лініяй XV зьезду і правым ухілам.

*Пастанова маскоўскае губпартканфэрэнцыі па дакладзе ЦК.*

МАСКВА, 27-2. У пачатку раніцішняга пасяджэньня губпартканфэрэнцыі 26-га лютага выступіў т. Яраслаўскі з прамоваю наконт 60-цігодзьдзя Крупскай.

Разам з намі,—сказаў Яраслаўскі—рабочая клясa ўсяго сьвету пажадае ёй бадзёрасьці і здароўя, каб яна магла сваімі вачыма ўбачыць поратогу камунізму ва ўсім сьвеце. Апошнія словы Яраслаўскага выклікалі гучную авацыю.

Потым выступіў з заключным словам т. Молатаў. **Рэзалюцыя па дакладзе ЦК была прынята канфэрэнцыяй адназгодна.**

На вячэрнім пасяджэньні т. Яраслаўскі зрабіў справаздачны даклад аб працы ЦКК.

Маскоўская губпартканфэрэнцыя ў рэзалюцыі па дакладзе ЦК **ЦАЛКАМ УХВАЛІЛА ПАЛІТЫЧНУЮ І АРГАНІЗАЦЫЙНУЮ ЛІНІЮ ЦК.** Канфэрэнцыя адзначыла **ШМАТ БУЙНЫХ ПОСЬПЕХАЎ, ДАСЯГНУТЫХ ПАРТЫЯЙ У СПРАВЕ ДАЛЕЙШАЕ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ КРАЮ І КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ СЕЛЬСКАЕ ГАСПАДАРКІ,** таксама як і ў справе ўздыму матар'яльнага і культурнага дабрабыту рабочае клясы, умацаваньня саюзу рабочых і сялян і выцісканьня капіталістычных элемэнтаў. Посьпехі ў справе разьвіцьця прамысловасьці дазваляюць зрабіць новы крок наперад да замацаваньня саюзу рабочае клясы і вясковае беднаты з масаю серадняцтва ў пэрыяд сацыялістычнай рэканструкцыі ўсяе народнае гаспадаркі.

Канфэрэнцыя лічыць патрэбным рабіць і далей **ШЫРОКУЮ ПАДМОГУ БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІМ ІНДЫВІДУАЛЬНЫМ ГАСПАДАРКАМ,** але ў той-жа час **НЯЎХІЛЬНА ПРАВОДЗІЦЬ І НАСТУП НА КУЛАЦКА-КАПІТАЛІСТЫЧНЫЯ ЭЛЕМЭНТЫ ВЁСКІ.**

Канфэрэнцыя падкрэсьлівае, што толькі ажыцьцяўленьне каапэрацыйнага пляну Леніна можа шырока і магутна ўзьняць сельскую гаспадарку і культурны ўзровень сялянства і зьнішчыць кулацкую эксплёатацыю.

Ажыцьцяўленьне высунутых партыяй задач **УЗДЫМУ НАРОДНАЕ ГАСПАДАРКІ НА САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ АСНОВЕ І ДАЛЕЙШАЕ ПАЛЕПШАНЬНЕ СТАНОВІШЧА РАБОЧЫХ** магчыма толькі пры рацыяналізацыі вытворчасьці, зьніжэньня сабекошту, павялічэньні прадукцыйнасьці працы і ўзмацненьні працы ў галіне культурнае рэвалюцыі.

Закранаючы ўнутрыпартыйнае становішча, канфэрэнцыя ўхваляе ўсе меры ЦК па барацьбе з трацкізмам і лічыць патрэбным упарта прадоўжваць гэтую барацьбу, таксама, як і барацьбу з прымірэнцтвам. Апрача трацкізму патрэбна барацьба з галоўнаю небясьпекаю сучаснага пэрыяду—адкрытым апартуністычным правым ухілам. Рэзалюцыя адзначае, што зараз, ва ўмовах абвастрэньня клясавай барацьбы асабліва вяўляюцца шкоднымі ваганьні між палітыкаю ўзмоцненага наступу на кулака і тэорыяй мірнага ўрастаньня кулака ў сацыялізм. Канфэрэнцыя лічыць, што **ПАРТЫЯ НЯ МОЖА ЦЯРПЕЦЬ ВАГАНЬНЯЎ МІЖ ЛІНІЯЙ ХУ ЗЬЕЗДУ І ПРАВЫМ УХІЛАМ,** бо гэтыя ваганьні няўхільна вядуць у дробна-буржуазнае балота. Палітычнае афармленьне правага ўхілу стварае ў сучасны момант простую нагрозу фракцыйнае антыпартыйнае дзейнасьці з боку правых і прымірэнчых да іх элемэнтаў. Асабліва важна, каб ЦК у цяперашні цяжкі момант забясьпечыў жалезную бальшавіцкую дысцыпліну з боку кожнага партыйца, на якім бы посьце ён ні стаяў.

## Дэтэрдынг націскае на латвійскіх капіталістаў.

### ЧАСТКА КАМЭРСАНТАЎ ЛАТВІІ ПРАВАКУЕ ЛІКВІДАЦЫЮ ГАНДЛЁВАГА ЎГАВОРУ З САВЕЦКІМ САЮЗАМ.

#### Запытаньне рабоча-сялянскае фракцыі ў сойме.

РЫГА, 26-2. Рабоча-сялянская фракцыя падала ў сойм запытаньне міністру замежных спраў Балёдысу, ці не пагражаюць латвійска-савецкаму ўгавору і наогул эканамічным дачыненьням між абодвымі краямі падзеі апошніх дзён: вобыскі і арышты на рыскіх складах савецкага гандлёвага флёту, цкаваньне савецкага паўнамоцнага прадстаўніцтва з боку некаторых латвійскіх газэт 1 г. д.

Выступіўшы з абгрунтаваньнем запытаньня Ляйцэнс заявіў, што частка латвійскіх камэрсантаў, пад нажымам эўрапейскіх капіталістаў, напрыклад, нафтавага трэсту Шэл, які баіцца канкурэнцыі Нафтасындыкату СССР, імкнецца ліквідаваць гандлёвы ўгавор з СССР. Між тым, угавор апраўдаў сябе на практыцы, даў поўны прыбытак латвійскай прамысловасьці і забясьпечыў працаю 6 тысяч латвійскіх рабочых.

Застаючыся пры эканамічным пункце гледжаньня нельга цавесьці патрэбу скасаваць гэты ўгавор. З гэтае прычыны памянёныя латвійскія колы стаповацца на шлях эканамічнае праваканыі, каб дамагчыся скасаваньня ўгавору. Рабоча-сялянская фракцыя патрабуе ад Балёдыса справаздачы, як ён глядзіць на гэтую крытыку. Адказу Балёдыса трэба чакаць у аўторак.

### Шкодная пазіцыя латвійскае прэсы.

#### ВОДГУКІ НА АВАНТУРЫ БЛЮМЭНТАЛЯ Ў МАСКВЕ.

РЫГА, 26-2. Латвійская буржуазная прэса, спрабуючы замазаць сапраўдны сэнс справы абвінавачанага ў спэкуляцыі камэрцыйнага дарадчыка латвійскае місіі ў Маскве Блюмэнталя, у апошнія дні вымяшчае на сваіх старонках розныя беспадстаўныя выдумкі. Так, напрыклад, газэты пішуць пра нейкіх «супрацоўнікаў савецкага гандлёвага прадстаўніцтва» ў Латвіі, якія, нібыта, сьпешна выехалі з Латвіі, каб ухіліцца ад пагражаючай ім з невядомае прычыны адказнасьці». Друк паведамляе таксама, нібыта савецкі суд ухваліў нейкую завочную пастанову па справе Блюмэнталя, хоць латвійскай уладзе павінна быць вядома, што Блюмэнталь ужо 2 месяцы назад быў зволены на месцы ў катэгорыі Давідовіча. Характэрна, што Блюмэнталь, як гэта выявілася, утаіў гэты факт ад латвійскае місіі і міністэрства замежных спраў.

Латвійская прэса выразна ня хоча разумець сур'ёзнасьці пытаньняў, высунутых справаю Блюмэнталя. Больш сур'ёзныя газэты пачынаюць, аднак, выказваць цьвярозыя адносіны да гэтае справы. Так, «Пэдэя Брыдзі» сёньня крытыкуе „Латвіяс Сарге" за яе лёгкадумныя адносіны да справы Блюмэнталя. Газэта лічыць «немагчымым так асьвятляць пытаньне, якое абвастрае нармальныя дыпляматычныя і гаспадарчыя адносіны з суседзямі Латвіі і перашкаджае іх разьвіцьцю". Газэта лічыць, што такія адносіны да пытаньняў вялічэзнае значнасьці заслугоўваюць ганьбы. «Сацыял-Дэмакратс» востра пратэстуе проці сучаснага курсу латвійскага ўраду ў адносінах да СССР.

## Франка-бэльгійскі тайны ўгавор.

### Адхіленьне, якое не адхіляе...

ПАРЫЖ, 26-2. Агенцтва Вольфа агаласіла афіцыйнае камунікэ бэльгійскага ўраду, якое катэгарычна адхіляе сапраўднасьць зьмешчанага ва „Утрэхт Тагблят" тэксту франка-бэльгійскага ваеннага ўгавору. У камунікэ зазначана, што сапраўдны тэкст угавору, які мае на ўвазе толькі напад з боку Нямеччыны, нічым ня выкліканы, быў толькі паведамлен парляментам Бэльгіі і Францыі ў 1920 годзе Сакрэтныя засталіся толькі формы канкрэтнага прыстасаваньня гэтага ўгавору, распрацаваныя генэральнымі штабамі Францыі і Бэльгіі.

Нарэшце бэльгійскі ўрад заяўляе, што падроблены дакумант агалошан з мэтаю сапсаваць дачыненьні між Бэльгіяй і Галяндыяй.

### „Утрэхт Тагблят" настойвае на сваіх выкрыцьцях.

*БЭРЛІН, 26-II. Газэта «Утрэхт Тагблят», якая агаласіла тэкст франка-бэльгійскае ваеннае згоды заяўляе, што адхіленьні французкага, бэльгійскага і ангельскага ўрадаў зусім не адхіляюць сапраўднасьці агалошанага тэксту ваеннае згоды.* Тэкст ваеннае згоды быў агалошан толькі пасьля таго, як рэдакцыя атрымала З БЯССПРЭЧНАЙ ПЭЎНАЕ КРЫНІЦЫ падцьверджаньне сапраўднасьці дакумантаў.

*У нямецкіх палітычных колах думаюць, што пад «бясспрэчна пэйнаю крыніцаю» трэба разумець галяндзкі ўрад.*

### Замешан Вандэрвэльдэ...

ПАРЫЖ, 26-2. Агенцтва Гаваса паведамляе: «Выступаўшы ў спрэчках бэльгійскі міністр замежных спраў Гіманс абвясьціў дакумант, агалошаны галяндзкаю газэтаю, падробленым. Міністр заявіў, што франка-бэльгійская згода 1920 году зьяўляецца выключна абарончай канвэнцыяй, якая ніколі не супярэчыць статуту Лігі Нацый.

Выступіўшы потым Вандэрвэльдэ назваў выкрываньні галяндзкае газэты нічуваною манаю і заявіў, што сапраўдны тэкст франка-бэльгійскае згоды дапанаваны ў Лізе Нацый. «Калі мяне абвінавачваюць,—заначыў Вандэрвэльдэ—у тым, што я, вяўляючыся міністрам замежных спраў, падрыхтоўваў вайну проці Італіі, Гішпаніі і Галяндыі, дык я лічу, што гэта ўжо занадта".

## Рост цікавасьці ў Францыі да савецкіх рынкаў.

### БОЯЗЬ ЗАСТАЦЦА Ў ХВАСЬЦЕ.

ПАРЫЖ, 26-2. Левая газэта «Пары Суар» пералічвае прыкметы ажыўленьня эканамічнае палітыкі СССР і, між іншым падкрэсьлівае значэньне савецка-нямецкае згоды і ўгавораў, падпісаных у апошні час між савецкім урадам і амэрыканскімі трэстамі і надыходзячага падарожжа дэлегацыі ангельскіх прамыслоўцаў у СССР і г. д. Газэта пенакоіцца, што Францыя, якая дае магчымасьць іншым краём выпрадзіць сябе ў аднаўленьні эканамічных сувязяў, страціць выгады, якія атрымаюць іншыя дзяржавы.

### АЦЭНКА ФРАНЦУСКАЮ ПРЭСАЮ ПЭРСПЭКТЫЎ АНГЛА-САВЕЦКІХ ДАЧЫНЕНЬНЯЎ.

ПАРЫЖ. „Ом Лібр" прысьвечвае артыкул падарожжу ў СССР дэлегацыі ангельскіх прамыслоўцаў. Водгук слоў газэты, выяўленае ў некаторых ангельскіх колах імкненьне аднавіць зносіны з СССР тлумачыцца тым, што з часу разрыву англа-савецкіх дачыненьняў ангельскі гандаль з СССР вельмі звузіўся.

Наконт пытаньня аб канцэсіях газэта піша, што пры адсутнасьці дыпляматычных зносін між СССР і Англіяй ангельскія капіталісты будуць знаходзіцца ў горшых умовах у параўнаньні з іншымі краямі, бо ў Маскве ў іх няма афіцыйнага прадстаўніцтва, якое ахоўвала-б іх інтарэсы. Падкрэсьліваючы, што такі-ж погляд мае і ўплывовы ангельскі кансэрватыўны орган «Дэйлі Тэлеграф», «Ом Лібр» робіць вывад, што нават з пункту гледжаньня ангельскіх кансэрватараў, аднаўленьне зносін з СССР зьяўляецца зараз больш пажаданым, чымся раней, і што падаўна падпісаныя савецка-нямецкія канвэнцыі могуць толькі ўзмацніць гэты рух за аднаўленьне англа-савецкіх дачыненьняў.

### УЗРАСТАЕ ПАГРОЗА ГРЭКА-ТУРЭЦКАЕ ВАЙНЫ.

КАНСАНТЫНОПАЛЬ, 26-2. Абмяркоўваючы грэка-турэцкія перагаворы, уплывовы рэдактар „Джумхурэт" Юнус Надзі піша: „Заціжка перамоў тлумачыцца тым, што Вэнізэлёс хоча вайны і імкнецца выйграць час. У выпадку далейшых уступак з боку Турцыі, вайна стане няўхільнаю. Вэнізэлёс рыхтуецца да вайны шпаркa, але ўпотайкі. Няўдалы гэрой малаазійскае экспэдыцыі (вайна 1920-23 году) знаходзіцца ва ўладзе хімэры рэваншу. Адказнасьць за будучую вайну ўскладаецца на Грэцыю".

### Арыштован т. Вайян Кутур'е.

ПАРЫЖ, 26-2. Сёньня ў Парыжу арыштован рэдактар цэнтральнага органу камуністычнае партыі «Юманітэ» Вайян Кутур'е ў зьвязку са справаю, узьнятаю проці яго за агалошэньне артыкулу аб Кітаі ў 1927 годзе.

### Высокая якасьць нашых аэрасаняў.

МАСКВА. Даведаны ў справах нітайскае рэспублікі ў СССР Ляо-Шы-кун зьвярнуўся да камітэту аэрасаняга прабегу „Аўтадору" з просьбаю даць яму магчымасьць азнаёміцца з канструкцыяй савецкіх аэрасаняў. 24 лютага Ля-Шы-кун быці прадэманстраваны лёгкія спартыўныя аэрасані сыстэмы ЦАГІ. Пасьля падрабязнага агляду Ляо-Шы-кун і ataша місіі Кон-Ень-жун праехалися на санях па шашы і па сьнежнай цаліне на адлегласьці 50 кілёмэтраў. Вярнуўшыся, Ляо-Шы-кун адзначыў высокую якасьць савецкіх аэрасаняў.

## Супроць фашысцкага тэрору ў Заходняй Беларусі.

### ПРАЦОЎНЫЯ ГОР. МЕНСКУ ПРАТЭСТУЮЦЬ СУПРОЦЬ ПРАЦЭСУ НАД ГРАМАДОЙ.

Менскія рабочыя абураны новай спробай польскага фашызму прыдушыць імкненьні рабочых і сялян Заходняй Беларусі да нацыянальнага і сацыяльнага вызваленьня.

Гэтымі днямі на заводзе **Бальшавік** адбыўся вялікі мітынг пратэсту, на якім выступіў тав. Калбуг з інфармацыяй аб Грамадзе і аб фашысцкім тэроры ў Польшчы. Сход аднагалосна прыняў рэзалюцыю, у якой ганьбіць люты ўціск польскімі панамі рабочых і сялян Заходняй Беларусі.

На заводзе **Чырвоная Зорка** тав. Рубінштэйн паінфармаваў агульны сход рабочых і служачых аб пераглядзе справы Грамады ў Польшчы. Сход аднагалосна прыняў рэзалюцыю пратэсту супроць тэрору над працоўнымі Зах. Беларусі. Сход прыняў прапанову пераслаць прывітаньні палітычным вязьням, якія зараз пакутуюць у польскіх турмах.

* * *

На заводзе **Энэргія**, на агульным сходзе рабочых і служачых выступіў з дакладам т. Рагаліс, у якім ён пазнаёміў сход са справай Грамады. Сход аднагалосна прыняў рэзалюцыю, якой ганьбуе агідную палітыку польскай буржуазэі ў Заходняй Беларусі, дзе з карэньнем вырываюцца ўсе нацыянальна-культурныя запатрабаваньні беларускіх працоўных мас.

* * *

Заслухаўшы даклад т. Ігнатоўскага аб апэляцыйным судзе над Сялянска-Работніцкай Грамадой, агульны сход студэнцтва і настаўніцтва Менскага Педагагічнага Тэхнікуму заўважае, што Грамада два гады таму назад была разгромлена польскім фашызмам і нарадавыя барацьбіты яе ўжо два гады церпяць зьдзекі ў польскіх турмах, што судом над Грамадой польскі фашызм імкнецца расьцерабіць сабе шлях у сваёй падрыхтоўцы да ўзброенага наступу на СССР і ў першую чаргу на Савецкую Беларусь і Украіну.

„Мы пратэстуем супроць зьдзекаў над Сялянска-Работніцкай Грамадой, бо ў яе асобе польскі фашызм зьдзекуецца над усім беларускім народам.

Мы патрабуем поўнага вызваленьня ўсіх зьняволеных грамадаўцаў. Мы заклікаем усіх працоўных узьняць свой голас пратэсту супроць прысуду над Грамадою і ўзмацніць матар'яльную дапамогу для падтрыманьня палітзьняволеных і іх сем'яў.

Няхай жыве барацьба і салідарнасьць працоўных над фашызмам.

Няхай жыве моцны саюз працоўных, батракоў і беднацка-серадняцкага сялянства ўсяго сьвету.

Агульны сход студэнцтва і настаўніцтва Беларускага Педтэхнікуму пастанавіў адлічыць на карысьць палітзьняволеных-грамадаўцаў 1 проц. ад стыпэндыі студэнтаў і пэнсіі настаўніцтва за люты месяц.

### Патрабуем вызваленьня ўсіх палітзьняволеных

(Голас менскай камсамолі).

Над акрываўленымі землямі, разбранымі нязыносным падаткам і рабаўніцтвам вёскамі, замучанымі рабочымі і сялянамі Заходняй Беларусі панує і ўзмацняецца дзікі белы тэрор. Тысячы лепшых рэвалюцыянэраў-барацьбітоў, якія вядуць бязьлітасную барацьбу за нацыянальнае самавызначэньне краіны, кінуты ў катаржныя турмы.

Год таму назад польскі фашызм разграміў статысячную арганізацыю рабочых і сялян Заходняй Беларусі—Сялянска-Работніцкую Грамаду. Польскі фашысцкі суд кінуў на катаргу на 209 год лепшых грамадаўцаў. Зруйнавана апошняя культурна-асьветная масавая арганізацыя—Таварыства Беларускай Школы.

Але, на гледзячы на ўсе стараньні польскай шляхты пашчэпіць сьвядомасьці пятлю на шыі працоўных мас, рэвалюцыйны рух у Заходняй Беларусі, пад кіраўніцтва камуністычнай партыі, усё больш і больш разгортваецца і ўзмацняецца, узьнімаючы шырокія масы на барацьбу супроць існуючага фашысцкага ладу.

У гэтай вялікай барацьбе працоўных за вызваленьне Заходняй Беларусі з пад уціску панаў, камсамол і рабоча-сялянская моладзь—на перадавых пазіцыях.

Польскі фашызм імкнецца дробнымі абарончымі падачкамі перацягнуць на свой бок верхавіну буржуазнай беларускай інтэлігенцыі, каб іх рукамі ажыцьцяўляць прыгнечаньне беларускага народу.

Сход актыву менскай камсамольскай арганізацыі ганьбіць учынкі фашысцкага Ураду Польшчы і горача пратэстуе супроць нічуваных зьдзекаў і белага тэрору над працоўнымі масамі Заходняй Беларусі і заклікае ўсіх камсамольцаў і рабоча-сялянскую моладзь Беларусі таксама ўзьняць свой голас пратэсту.

Мы патрабуем вызваленьня ўсіх палітзьняволеных!

Мы патрабуем спыненьня дзікага белага тэрору над працоўнымі Заходняй Беларусі!

Няхай жыве камуністычная партыя Польшчы і Заходняй Беларусі, пад кіраўніцтвам якой рабочыя і сяляне Заходняй Беларусі вызваляцца з-пад панскага ўціску!

Братэрскае вітаньне баявому камсамолу Польшчы і Заходняй Беларусі—атрыду памоцніку камуністычнай партыі!

### ПРАТЭСТ ПРАЦОЎНЫХ Г. БАРЫСАВА.

БАРЫСАЎ, 26-II. Па шэрагу прадпрыемстваў Барысава праводзяцца масавыя мітынгі рабочых супроць тэрору польскага фашызму над Беларускай Грамадой.

На заводзе «Домбаль» абмяркоўваўся вялікі мітынг. Робочыя, заслухаўшы інфармацыю аб тэроры над Грамадой і прыгнечаньні працоўных Зах. Беларусі і Польшчы, з абурэньнем асуджаюць тэрор польскага фашызму і прыгнечаньне працоўных мас. Рабочыя патрабуюць вызваленьня асуджаных тысячы нявінных людзей, кінутых у турмы.

Рабочыя Барысава ўпэўнены ў тым, што спроба фашыстаў прыдушыць рэвалюцыйны рух на ўдасца.

## Да працэсу „Грамады".

*Згодна з паведамленьнямі польскай прэсы, якія зьявіліся ўжо досыць даўно, сёньня павінен пачацца ў варшаўскім апэляцыйным судзе перагляд справы віленскай групы «Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады». Пасьля гэтага ніякіх вестак аб перагляндзе справы ў польскай прэсе больш ня было. Можна таму думаць, што польскай прэсе забаронена пісаць што-небудзь у сувязі з перагляданам працэсу, бо інакш яе поўнае маўчаньне трудна растлумачыць.*

*Толькі адно віленскае „Слово" (№ 47) зьмяшчае заметку аб тым, быццам „у Менску вядзецца заўзятая кампанія з прычыны збліжаючайся апэляцыйнай судовай расправы проці «Грамады» і г. д.*

## Дэманстрацыя польска-румынскае агрэсыўнае дзейнасьці.

### ВЫНІКІ НАРАД МІРАНЭСКУ З КІРАЎНІКАМІ ПОЛЬСКАЕ ДЗЯРЖАВЫ

ВАРШАВА, 27-2. У вязьку з пабытам румынскага міністра замежных спраў Міранэску ў Варшаве, сёньня агалошана такое афіцыйнае паведамленьне: «У часе свайго пабыту ў Варшаве 25 і 26-та лютага румынскі міністр замежных спраў Міранэску мае некалькі спатканьняў з польскім міністрам замежных спраў Залескім і быў прыняты прэзыдэнтам рэспублікі Масьціцкім, маршалам Пілсудзкім, а таксама старшынёю рады міністраў Бартэлем. У гутарках абмяркоўваліся ўсе галоўныя пытаньні, у якіх зацікаўлены абодвы краі і была ўстаноўлена поўная аднадушнасьць польскага і румынскага ўраду ва ўсіх гэтых пытаньнях. Дасягнута згода аб скліканьні спэцыяльнае канфэрэнцыі, задача якое —абмеркаваць усе эканамічныя праблемы, якія вынікваюць з існаваньня саюзу між абедзьвюма дзяржавамі. У часе гутарак Міранэску з польскімі дзяржаўнымі дзеячамі адбыўся таксама і абмен думкамі на агульнапалітычных пытаньнях наконт інтарэсаў абодзьвух краёў. Гэты абмен думкамі даў магчымасьць яшчэ раз устанавіць поўную аднадушнасьць і адзіную волю абодзьвух урадаў працаваць далей для ўмацаваньня спакою».

### У РУМЫНІЮ ЕДУЦЬ ПІЛСУДЗКІ І ЗАЛЕСКІ.

*ВАРШАВА, 26-II. Румынскі міністр замежных спраў Міранэску заявіў на прыёме журналістаў, што ўлетку 1929 году Пілсудзкі і Залескі паедуць з афіцыйным візытам у Румынію.*

### ЭСТОНСКАЯ РЭАКЦЫЯ АРЫЕНТУЕЦЦА НА АНГЛІЮ І ПОЛЬШЧУ.

РЭВЕЛЬ. Генэрал Ляйдонэр выступіў на канфэрэнсе аграрыяў з прамоваю аб міжнародным становішчы Эстоніі. Ляйдонэр зазначыў, што Эстонія павінна палтрымліваць добрыя зносіны з тымі дзяржавамі, ад якіх ёй можа пагражаць небясьпека. У першую чаргу, водгук слоў Ляйдонэра, гэта датычыць СССР і Нямеччыны.

„У сучасны момант, заявіў Ляйдонэр,—у нас існуюць прыяцельскія дачыненьні з СССР, але невядома, ці захаваецца такое становішча і на будучыню. Нямеччына знаходзіцца зараз у цяжкіх умовах, але ў будучым нямецкі народ пашырыць свой уплыў і паколькі Нямеччына імкнецца на ўсход, дык тут могуць выбухнуць перашкоды".

Далей Ляйдонэр падкрэсьліваў супольнасьць інтарэсаў Эстоніі і Польшчы і заклікаў да арыентацыі на Англію, якая, водгук яго слоў, асабліва зацікаўлена ў існаваньні Эстоніі.

## Пад ленінскім штандарам.

„Правда" ў артыкуле пад загалоўкам „Под ленинским знаменем" піша:

Учора на маскоўскай партканфэрэнцыі скончылася абмеркаваньне дакладу ЦК партыі. Маскоўскія бальшавікі, зьвяўшыся на канфэрэнцыю з вялічэзным вопытам працы, шырока і сур'ёзна абмеркавалі даклад ЦК і **аднагодна ўхвалілі палітычную і арганізацыйную лінію і працу ЦК,** пад кіраўніцтвам якога ўся партыя, у тым ліку і маскоўская арганізацыя ажыцьцяўляе пастановы 15-га зьезду,—пастановы, якія зьяўляюцца адзіна правільнымі і даюць верную ўстаноўку—**ЛІНІЮ ПЕРАМОЖНАГА БУДАЎНІЦТВА САЦЫЯЛІЗМУ.**

Правыя элемэнты робяць спробу схіліць партыю ў бок ад генэральнае лініі, грунтуючыся на няправільнай прадпасылцы аб урастаньні кулака ў сацыялізм, ня бачачы абвастрэньня клясавае барацьбы на вёсцы, на справе адмаўляючыся ад наступу на капіталістычныя элемэнты. «Ва ўмовах абвастрэньня клясавае барацьбы,—заявіла канфэрэнцыя,—асабліва цяжкім зьяўляецца ваганьне між дзьвюма незамірымы процілеглымі лініямі: між палітыкаю ўзмоцненага наступу на кулацтва і капіталістычныя элемэнты і тэорыяй мірнага ўрастаньня кулака ў сацыялізм, бо гэта на справе азначае адмову ад наступу на кулацтва, разьвязваньне капіталістычных элемэнтаў і крок да аднаўленьня ўлады буржуазеі».

Партыя дасьць **БЯЗЬЛІТАСНЫ АДПОР ПРАВЫМ АПАРТУНІСТЫЧНЫМ ЭЛЕМЭНТАМ,** якія спрабуюць зрываць каапэрацыйны плян Леніна.

Леташні год быў годам усё больш шырокага ўдзелу пралетарыяту ў сацыялістычнай перабудове народнае гаспадаркі. Гэта—год разгортваньня самакрытыкі партыі і рабочай клясы. Нагным паклёпам, які нічым не адрозьніваецца ад трацкісцкіх паклёпаў, вяўляецца заява правых элемэнтаў аб бюракратызацыі партыі, аб зажыме і г. д. Гэтыя элемэнты выкрываюць свой адрыў ад партыйнага жыцьця, адрыў ад рабочае масы, якая актыўна будуе сацыялістычную гаспадарку. **Партыя нікому не дазволіць паслабіць партыйнае кіраўніцтва рабочай клясай,** арганізаванай у прафсаюзы, і дасьць адпор спробам проціставіць прафсаюзы партыі.

Канфэрэнцыя падсумавала вынікі ў галіне ўнутрыпартыйнага жыцьця. Пастановамі зьезду трацкісцкая апазіцыя была выкінута з партыі. Партыя, і ў тым ліку ў першых шэрагах маскоўская арганізацыя, нанесла руйнуючы ўдар трацкістам. Яна будзе і далей выкрываць контррэвалюцыйную сутнасьць трацкізму і бязьлітасна змагацца са спробамі адраджэньня трацкісцкае ідэаалёгіі ў нашай партыі.

Аднак, ужо за год, год пасьпяховага сацыялістычнага наступу, мы апынуліся перад другою небясьпекаю, галоўнаю небясьпекаю правага ўхілу ў партыі. Асобныя ваганьні ўсё больш афармляюць і афармляцца ў асобную плятформу правага ўхілу, у плятформу, якая аб'ектыўна азначае разьвязваньне капіталістычных элемэнтаў у краі. Ваганьні, прымірэнчыя адносіны да правае небясьпекі, мелі месца ў кіраўніцтве маскоўскае арганізацыі. Маскоўскія бальшавікі, верныя Леніну, ня здрэйфілі перад цяжкасьцямі, не паддаліся перапуду і дасканала вытрымалі экзамэн, яшчэ больш згуртаваўшы свае шэрагі **Ў БАРАЦЬБЕ ЗА ЛЕНІНІЗМ ПРОЦІ АПАРТУНІЗМУ.** Здавалася-б, што тыя, хто хістаўся, павінны былі падначаліцца дысцыпліне партыі, прыслухацца да голасу партыі, выправіць свае памылкі. Аднак, факты апошняга часу гавораць аб узмоцненьні барацьбы правых проці лініі партыі. Спэкулюючы на цяжкасьцях, рэвізуючы Леніна, парушаючы дысцыпліну, прарочачы крызісы і г. д., правыя элемэнты знаходзяцца перад небясьпекаю скаціцца на шлях фракцыйнае барацьбы.

Канфэрэнцыя **ПА-БАЛЬШАВІЦКУ** паставіла пытаньне, каб ЦК у сучасны цяжкі момант забясьпечыў **БЕЗАГАВОРАЧНАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ЖАЛЕЗНАЕ БАЛЬШАВІЦКАЕ ДЫСЦЫПЛІНЫ З БОКУ КОЖНАГА ЧЛЕНА ПАРТЫІ,** якую-б ролю ў партыі ён не адыгрываў. Гэта павінна азначаць бязумоўнае выкананьне кожным членам партыі, у тым ліку і членамі ЦК, даручанае яму працы пад кіраўніцтвам і кантролем партыі і яе ЦК. Партыя мае права сказаць правым і прымірэнцам: альбо з партыяй, безагаворачна выконваючы яе пастановы і дысцыпліну, альбо з правым ухілам, якія, як і кожны ўхіл, вядзе ў апартуністычнае балота.

## Непераможны крызіс нямецкае сацыял-дэмакратыі.

### АНТЫПРАЛЕТАРСКАЯ ПАЛІТЫКА МЕНШАВІЦКАГА ЦК НАДЗВЫЧАЙНА АБУРАЕ ПАРТЫЙНЫЯ МАСЫ.—РАБОЧЫЯ-МЕНШАВІКІ ДЗЕСЯТКАМІ ПЕРАХОДЗЯЦЬ У КАМПАРТЫЮ.

БЭРЛІН, 26-2. Крызіс нямецкае сацыял-дэмакратыі паглыбляецца. На акруговай канфэрэнцыі ў Лейпцызе, дзе, як вядома, пераважае ўплыў так званых левых, сэкратар акруговага камітэту Ліпінскі зачытаў заяву, зробленую рэйхсканцлерам Мюльлерам на апошнім пасяджэньні выканаўчага камітэту партыі. Мюльлер заявіў на гэтым пасяджэньні, што ніякая пастанова партыі не перашкодзіць яму даць згоду на асигнаваньне другое часткі грошай з каштарысу на пабудову панцырнага крэйсэра. Дэлегаты акруговае канфэрэнцыі абураны гэтаю заявай Мюльлера і адзін з дэлегатаў—рабочы — падаў прапанову выключыць Мюльлера з партыі. „Левым" лідэрам удалося, хоць і ня так лёгка, угаварыць рабочага ўзяць гэтую прапанову назад. Канфэрэнцыя ўхваліла рэзалюцыю, у якой патрабуе выхаду сацыял-дэмакратаў з ураднавае кааліцыі і пратэстуе проці падатковае палітыкі сацыял-дэмакратычнага міністра фінансаў Гільфэрдынга.

Агульны сход сацыял-дэмакратаў у Гальлі скончыўся бурнымі сцэнамі. Прысутныя на ім рабочыя патрабавалі пераабраць масцовыя камітэты партыі. Урэшце, сход разышоўся пасьля ўхвалы зусім няўразьнае рэзалюцыі, правільнасьць галасаваньня якое пад вялікім западозраньнем. У Варнаў (недалёка ад Данцыга) пераживаемы крызіс сацыял-дэмакратыі выклікаў раскол. У выніку спрэчак па дакладзе камуністычнага прамоўцы, якому ўдалося выступіць на сацыял-дэмакратычным сходзе, скліканым сябрамі мясцовага камітэту с.-д. партыі, 20 сацыял-дэмакратычных рабочых пераваліі з эс-дэкамі і перайшлі да камуністаў.

## Атрады Аманулы ў 30 кілёмэтрах ад Кабулу.

### ДА АМАНУЛЫ ДАЛУЧЫЛІСЯ НОВЫЯ ПЛЯМЕНЬНІ.

ТЭРМЕЗ, 23-2. Па кандагарскай дарозе з боку Газьні распачаўся наступ на Кабул. У Кабуле распаўсюджваюцца пракламацыі, што Аманула ўжо знаходзіцца ў ў Газьні, і што яго атрады нібыта ўзышлі на тэрыторыю блізкага да ільзаў пляменьня вардак, якое мае землі на паўднёвым усходзе ад кабульскае вобласьці. Хакім (павятовы начальнік) гораду Майдану, назначаны туды кабульскім урадам, забіты, і горад захоплен вардакскімі атрадамі Аманулы. З Кабулу сьпешна пасланы ў напрамку на Майдан падмацаваньне з 3 палкоў.

Майдан знаходзіцца ў 30 кілёмэтрах на паўднёвы захад ад Кабулу, каля скрыжавань ня шляхоў на Кандагар і на Герат праз Хэзарэйскую вобласьць.

### АНГЛІЯ СПРАБУЕ РАЗЬЯДНАЦЬ АЎГАНІСТАН

#### ПАДКУПЛЕНЫЯ МУЛЫ ЎЖО ПРАЦУЮЦЬ У ГЭТЫМ НАПРАМКУ.

ТЭРМЕЗ, 25-2. У вёсцы Када, недалёка ад Джалалабаду, пасядае рада вышэйшага духоўніцтва племя шынвары і кугіані. У радзе вялікую ролю адыгрываюць прыехаўшыя з Індыі выдатныя муллы, якія зьяўляюцца фактычна ангельскімі агентамі.

Анг

# ПОСЬПЕХІ І ЦЯЖКАСЬЦІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА.

*(Даклад т. Молатава на XVII маскоўскай губпартканфэрэнцыі*).*

Таварышы! 17 губэрская канфэрэнцыя сабралася больш, чым праз год пасьля 15-га зьезду партыі. Мінулы перыяд зьяўляецца досыць здавальняючым адрэзкам часу для апошніх асноўных дырэктыў 15-га зьезду партыі і вынікаў правядзеньня гэтых дырэктыў. Ужо на 15-ым зьезьдзе партыі былі падкрэсьлены асобныя труднасьці міжнароднай і ўнутранай абстаноўкі сучаснага перыяду. Ня гледзячы на гэта, аглядваючыся назад, мы бачым, што пазіцыі рабочае клясы Савецкага Саюзу за гэты час значна ўзмацніліся, і мы падышлі да вырашэньня карэнных задач будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне.

Зірнем, перш за ўсё, на міжнародныя абставіны, у якіх адбывалася разьвіцьцё Савецкага Саюзу за гэты перыяд.

## СУЧАСНЫ ЭТАП СТАБІЛІЗАЦЫІ КАПІТАЛІЗМУ І МІЖНАРОДНАЕ СТАНОВІШЧА САВЕЦКАГА САЮЗУ.

Шосты кангрэс Камінтэрну, увосень мінулага году, падагуліў вынікі разьвіцьця сусьветнага капіталізму за пасьляваенны перыяд. Гэтым 6-ты кангрэс паказаў, што сусьветны капіталізм дасягнуў за апошнія гады значных посьпехаў у росьце тэхнікі, у правядзеньні прамысловай рацыяналізацыі, у разгортваньні новых яшчэ больш магутных капіталістычных аб'яднаньняў (картэляў-трэстаў) наогул перайшоў за даваенны ўзровень. Пры падтрыманьні міжнароднага рэфармізму буржуазея дасягнула поўных посьпехаў.

Шосты кангрэс разам з тым паказаў, што рост капіталістычнай тэхнікі, узмацненьне капіталістычнай рацыяналізацыі, стварэньне новых магутных картэляў і трэстаў, усё большае зрошчваньне капіталістычных арганізацый з дзяржаўнай буржуазнай сыстэмы ні ў якой меры ня ў стане згладзіць тых супярэчнасьцяй, якія ёсьць у капіталістычным разьвіцьці. Цяжар узрастаючага крызысу капіталізму знаходзіць адно з сваіх найбольш яскравых выяўленьняў у росьце беспрацоўя. З другога боку, з гэтым непарыўна зьвязаны факт узрастаючага паляваньня мас і ажыўленьня базавога пралетарскага руху. Рад фактаў мінулага году гаворыць аб тым, што нарастаюць элементы новага рэвалюцыйнага ўздыму ў рабочым руху. Такія падзеі, як перастварэньне забастоўкі лодзінскіх текстыльшчыкаў ва ўсеагульную забастоўку, якая ахопіла 150 тысяч рабочых, такія факты, як падзеі ў Руры, дзе адказам на лёкаут было выступленьне звыш чым 200 тысяч рабочых-мэталістых, а таксама рад іншых буйнейшых забастовак у Нямеччыне, Францыі, Чэха-Славакіі сьведчаць аб вялікіх рэвалюцыйных сілах, што вакалююцца ў нетрах рабочае клясы Эўропы.

Усё больш зьяўляецца сымптомаў таго, што рабочы рух у Эўропе побач з абарончымі баямі, пераходзіць у новую ступень, забываючы мясцамі наперакор намаганьням сапыял-дэмакраты і рэфармісцкіх прафсаюзаў яўна наступальны характар.

У адносінах калёніяльных і залежных ад імпэрыялізму краін таксама прыходзіцца паказаць наяўнасьць вялікіх рэвалюцыйных магчымасьцяй, якія могуць даць аб сабе ведаць у вельмі недалёкай будучыні.

Праблемы кітайскай рэвалюцыі застаюцца ня вырашанымі і не знаходзяцца на шляху да вырашэньня. Становішча ў Кітаі нагадвае нам тое, што мы мелі ў нашай краіне пасьля паражэньня 1905 году. Гэта значае, што новы ўздым рэвалюцыйнага руху рабочых і сялян у Кітаі зусім няўхільны. Гэты новы рэвалюцыйны прыліў бязумоўна нанясе магутнейшы ўдар ваеннамешчыцка-буржуазнаму блёку, што стаіць пяпер на чале ўлады, і імпэрыялізму, што пануе на справе ў Кітаі.

Трэба таксама адзначыць, што рэвалюцыйны рух у Індыі ўзьвімае новыя і новыя пласты рабочых і сялян. Аб гэтым у апошні перыяд асабліва сьведчаць рэвалюцыйныя забастоўкі ў Бамбэі, якія ня спыняюцца, і рэвалюцыйны рух у сялянскіх масах. Такім чынам, на Усходзе сьвецець рэвалюцыйныя сілы супроць імпэрыялізму.

Што датычыць узаемаадносін паміж самымі капіталістычнымі дзяржавамі, дык і тут факты гавораць аб росьце і абвастрэньні супярэчнасьцяй. Аб гэтым сьведчыць узрост узброеньняў, рост ваенных бюджэтаў. Барацьба двух асноўных імпэрыялістычных гігантаў—Англіі і ПАЗШ—набывае ўсё больш востры характар. Улетку мінулага году заключана ваенна-марская згода паміж Англіяй і Францыяй, якая прадстаўляе сабой спробу аднаўленьня Антанты супроць ПАЗШ і супроць СССР.

Небясьпека імпэрыялістычных войнаў і простага нападу на СССР робіцца ўсё больш актуальнай і вынікае з таго, што, ня гледячы на наяўнасьць посьпехаў у капіталістычнай эканоміцы, крызыс капіталізму ўсё больш паглыбляецца, усё больш расхіствае сыстэма капіталістычнага панаваньня.

Усё сказанае характарызуе міжнародную абстаноўку, у якой знаходзіўся СССР за гэты час. З гэтага вынікла неабходнасьць асабліва настойлівай барацьбы за палітыку міру і забесьпячэньне ўмоў мірнага сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне. У гэтых мэтах савецкі ўрад паставіў з асаблівай настойлівасьцю пытаньне аб разбраеньні перад усімі капіталістычнымі дзяржавамі.

Дэманстрацыйна мірны крок савецкага ўраду аб разбраеньні, які выклікаў вялікае спачуваньне працоўных усяго сьвету, імпэрыялістычныя ўрады сірабавалі варакрыць другім актам. Вядома, што ўрад ПАЗШ зьвярнуўся да іншых краін з сваім пактам аб адмаўленьні ад вайны, як прылады палітычнай палітыкі. Спроба надставіць сябе ў якасьці мірадворца, аднак, не ўдалася амэрыканскаму імпэрыялізму. Выступіўшы з пактам Келёга аб «адмове ад вайны», амэрыканскі ўрад яшчэ шырэй пасунуўся на шляху павялічэньня свайго ваеннага бюджэту, па шляху пабудаваньня новых марскіх ваенных суднаў і г. д. З свайго боку, савецкі ўрад ня толькі падпісаў пакт Келёга, але ўзяў на сябе ініцыятыву скарыстаньня пакту Келёга для працідзеяньня няўхільным намерам тых дзяржаў, якія асабліва сьпяшаюцца з разьвязаньнем вайны супроць СССР. З гэтай мэтай савецкі ўрад запрапанаваў Польшчы неадкладна-ж увесьці ў моц пакт Келёга на ўзаемаадносінах паміж СССР і таксама Польшчай. Падпісаўшы разам з Эстоніяй, Латвіяй і Румыніяй маскоўскі пратакол, Польшча тым самым узяла на сябе перад грамадзкай думкай пэўныя маральныя абавязацельствы, якія ня могуць не перашкаджаць разьвязаньню ваўнічых намераў супроць СССР. У гэтым польга ня бачыць пэўнага плюсу такіх неабходных для СССР мірных умоў далейшага сацыялістычнага будаўніцтва. У якіх замежных умовах знаходзіўся СССР за мінулы перыяд, можна ілюстраваць радам фактаў.

Гэтыя факты перш за ўсё сьведчаць аб тым, што на нашу краіну ня спыняўся з розных бакоў націск імпэрыялістычных дзяржаў.

... Адзак, спробы стварэньня адзінага імпэрыялістычнага фронту супроць Савецкага Саюзу да гэтага часу польга лічыць удалымі. Ёсьць факты, што сьведчаць аб адваротным. Так, у Амэрыцы нашы гандлёвыя сувязі за апошні час наогул палепшыліся. Аб гэтым сьведчыць у прыватнасьці дагавор з «Джэнэраль Электрык», ад якога мы атрымалі больш 60 мільёнаў рублёў доўгатэрміновага крэдыту. Нашы перагаворы з Нямеччынай па пытаньнях, зьвязаных з практыкай правядзеньня гандлёвага дагавору, а таксама аб вырашэньні спрэчных пытаньняў паміж Нямеччынай і СССР скончыліся здавальняюча. Нават у Англіі, у прамысловых колах заўважаецца пэўны пераварот у бок СССР. Аб гэтым сьведчыць стварэньне англійска-расейскага камітэту, пасылка буйной дэлегацыі прамыслоўцаў, якая маркуецца ў сакавіку для перагавораў аб крэдытах.

З усіх міжнародных абставін для нас вынікаюць наступныя асноўныя вывады. Папершае, Савецкі Саюз далей павінен няўхільна і настойліва праводзіць палітыку міру, мабілізуючы на гэтай аснове вакол СССР шырокія масы працоўных усіх краін. Падругое, нам неабходна ўсямерна скарыстаць магчымасьці паляпшэньня гандлёвых зносін—у гэтым яўна зацікаўлены ня толькі СССР, але і капіталістычныя краіны, якія асабліва маюць патрэбу ў рынках. Патрэцяе, мы яшчэ больш павінны ўзмацняць абарону нашай краіны, акружыць яшчэ большай увагай і клопатамі нашу Чырвоную армію.

Сёньня ў дзень 11-ай гадавіны Чырвонай армії мы павінны асабліва памятаць аб небясьпеках новых імпэрыялістычных нападаў на СССР. Праводзячы гэтую палітыку, мы ўзмацняем міжнародную ролю СССР, як апэнту сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі.

## ПОСЬПЕХІ ГАСПАДАРЧАГА БУДАЎНІЦТВА І НАШЫЯ ДАЛЕЙШЫЯ ЗАДАЧЫ.

Мы ставім перад сабою вялічэзныя задачы ў галіне разьвіцьця прамысловасьці. Уся рабочая класа Савецкага Саюзу ўскладае на вас выключную адказнасьць за справу кіраваньня гаспаларкай. Цяпер нам асабліва трэба ўзмацніць вашу работу ў двух кірунках, папершае, у кірунку ўсямернага ўзмацненьня рацыяналізатарскай работы прамысловасьці і, падругое, у кірунку ўсямернага падняцьця прадукцыйнасьці працы і ў вязьбу в гэтым падняцьця працоўнай дысцыпліны.

За мінулы час мы маем пэўныя посьпехі ў справе рацыяналізацыі. Так, наша фактавая цыфра словасць ужо пяпер у большай сваёй часьці знаходзіцца на ўзроўні перадавых капіталістычных краін. У галіне вугольнай прамысловасьці (Данбас) мы значна пасунуліся на шляху мэханізацыі (у гэтым годзе прадугледжана да 32 проц.) ужо значна перавышае адпаведны процант вугольнай прамысловасьці Англіі (20 пр.). У нас ёсьць посьпехі ў справе пераходу на работу непарыўным патокам (канвеер). Да 80 прадпрыёмстваў у гэй ці іншай меры ўжо праводзяць гэтую сыстэму, не гаворачы аб прадпрыёмствах, дзе раней гэта няўхільна было зьвязана з працэсам вытворчасьці.

Што датычыць прадукцыйнасьці працы, дык у гэтых адносінах зараз прыходзіцца адзначыць далёка нядобрае становішча. Першы квартал бягучага гаспадарчага году даў нам значнае меншае павышэньне прадукцыйнасьці, чым гэта намечана ў плане (12 проц. замест 17 проц.). У сувязі з гэтым прыходзіцца асобна адзначыць нядобрае становішча з працоўнай дысцыплінай на некаторых нашых прадпрыёмствах. Пытаньне ўзьвяцьця працоўнай дысцыпліны набывае зараз буйнейшае значэньне і выклікала неабходнасьць асобнай адозвы ЦК да ўсіх партарганізацый. Факты сьведчаць, што зьвяжэньне працдысцыпліны знаходзіць сваё адлюстраваньне, з аднаго боку, у пэўным паслабленьні адміністрацыйна-тэхнічага кіраўніцтва, з другога боку, тут праяўляецца ўсім невыстарчальная ўвага да гэтай справы з боку нашых прафесыянальных, а таксама партыйных арганізацый. Пераважная маса рабочых самым чулым чынам адносіцца да заклікаў партыі і савецкай улады аб падняцьці прадукцыйнасьці працы.

Аднак, ня рэдка на прадпрыёмствах ёсьць пэўныя групы, паасобныя элементы, якія дэзарганізуюча ўплываюць на ўсю вытворчую абстаноўку. У гэтым выяўляецца і тое, што за апошнія гады ў нашу прамысловасьць улілася вялікая колькасьць новых рабочых. За апошніх пяць год у нашы прадпрыёмствы адной толькі прамысловасьці ВСНГ прышло 1057 тысяч новых рабочых. Сярод іх не малая колькасьць зьвязанк з вёскай, інтарэсы якое нярэдка яшчэ пануюць для іх над інтарэсамі сацыялістычнай індустрыі. На прадпрыёмствы прышла і пэўная частка рабочых, якія ўчора яшчэ прапавалі ў якасьці самастойных саматужнікаў. Сустракаюцца сярод рабочых цяпер такія элементы, якія вышлі з буржуазных пластоў. Між тым нават простага вывучэньня складу рабочых нашы прафсаюзы да апошняга часу не вялі. Сацыялістычна-выхаваўчая работа сярод новых пластоў рабочых таксама пастаўлена надзвычайна слаба.

Усё гэта прымушае падкрэсьліць рад фактаў, якія сьведчаць аб простым зьвяжэньні працдысцыпліны, аб вусім недаўпачальных адносінах паасобных рабочых да сваіх абавязкаў на вытворчасьці.

Задачай прафесыянальных саюзаў зьяўляецца ўсямерная абарона матар'яльна-бытавых інтарэсаў рабочых. Іх задачай зьяўляецца таксама ўсялякае ўзмацненьне ўдзелу рабочых у справе кіраваньня прамысловасьцю, узмацненьня барацьбы з бюракратычнымі скажэньнямі у гаспачарчых органах, дапамогі рабочым-вынахідцам і г. д. Разам з тым справа сацыялістычнага выхаваньня рабочых зьвязана ў сучасных умовах з усямернай барацьбой па ўзмацненьні працдысцыпліны, вышчэньні прадукцыі, выкараненьні надбайных адносін да абсталяваньня, інструментаў, мэханізмаў, за стварэньне такой маральнай абстаноўкі на прадпрыёмствах, пры якой працаўлучыкі-дэзарганізатары вытворчасьці адчувалі-б сябе маральна асуджанымі, ізаляванымі ад пралетарскага асяродзішча. У гэтых адносінах работа нашых прафесыянальных, а таксама і партыйных арганізацый стаіць далёка не на адпаведнай вышыні.

Асабліва прыходзіцца адзначыць той факт, што ў парушэньні працдысцыпліны часта вінаваты камуністы і камсамольцы. Між тым, самым першым абавязкам камуністых і камсамольцаў разам з перадавымі беспартыйнымі рабочымі зьяўляецца быць застрэльшчыкамі ў справе падняцьця працдысцыпліны і на справе быць найбольш культурнымі, вытворча ўзорнымі рабочымі.

Асобна прыходзіцца сказаць аб неабходнасьці падняцьця працдысцыпліны сярод інжынэрна-тэхнічага пэрсаналу. Тут справа стаіць далёка нядобра. З другога боку, яўна невыстарчальнай зьяўляецца таксама барацьба са спэкуляцтвам, а таксама з простымі хуліганскімі ўчынкамі ў адносінах да інжынэрна-тэхнічага пэрсаналу. У зьвязку з гэтымі фактамі прыходзіцца падкрэсьліць неабходнасьць стварэньня такой маральнай абстаноўкі ў рабочым асяродзішчы, якая зрабіла-б немагчымым знаходжаньне на прадпрыёмствах хуліганаў—дэзарганізатараў вытворчасьці. Тым больш зараз трэба на гэта зазначыць, што ў нас ёсьць зьніжэньне ўдзельнае вагі інжынэрна-тэхнічага пэрсаналу на вытворчасьці.

Нарэшце, трэба падкрэсьліць неабходнасьць у адпаведнасьці з пастановамі партыі (напрыклад, XI партзьезду), забесьпячэньня „единначалия" ў гаспадарчым кіраўніцтве на ўсіх пытаньнях апэрацыйнага кіраўніцтва прадпрыёмствам. Патрэбны ўдзел прафесыянальных, партыйных арганізацый у правядзеньні гаспадарчых мерапрыёмстваў ні ў якім разе не павінен весьці да стварэньня якіх-небудзь элементаў трохкутэлка (ячэйка, завком, адміністрацыя), што можа весьці толькі да дэзарганізацыі работы на вытворчасьці. Трэба на справе павысіць адказнасьць гаспадарнікаў, адміністрацыйна-тэхнічага пэрсаналу за ўсю справу правядзеньня дырэктыў аб зьвяжэньні сабекошту, падняцьці працдысцыпліны, разам з тым трэба падняць работу прафесыянальных арганізацый, у прыватнасьці, вытворчых нарад для забесьпячэньня сьвядомага актыўнага ўдзелу рабочых у правядзеньні адпаведных мерапрыёмстваў. Камуністы і камсамольцы пры правядзеньні ўсіх гэтых мер павінны стаяць у першых радох, памятаючы, што тут зараз ляжаць галоўнейшыя задачы нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Цяпер перайду да пытаньня аб сельскай гаспадарцы.

Сельская гаспадарка за апошнія гады яўна адставала ў тэмпе разьвіцьця ад індустрыі. Гэта было зазначана яшчэ на 15-м зьезьдзе партыі. Сапраўды—апошнія тры гады прамысловая прадукцыя павялічылася ў сваёй каштоўнасьці больш, чым на 50 проц., прадукцыя сельскай гаспадаркі—усяго на якіх-небудзь 7 проц. Гэта выразна гаворыць аб розьніцы тэмпаў разьвіцьця прамысловасьці сельскае гаспадаркі. Лічбы, аднак, паказваюць на вясупынны рост пасэўнай плошчы і разам з тым на крайняю марудныя тэмпы росту. Пры гэтым, аднак, для 1928 году трэба ўлічыць надзвычайна вяспрыяючыя мэтэаралёгічныя ўмовы, якія аллюстраваліся на зьмяншэньні пасэўнай плошчы. Трэба ўлічыць таксама, што за гэтыя гады прыкметна пашырылася плошча пасеваў сацыялістычнага сэктару—калгасаў і савгасаў Апрача таго, вялікае значэньне мае той факт, што пры некаторым нават зьніжэньні ў 1928 годзе плошчы пад збожжавымі культурамі, шаркім тэмпам расла плошча сялянскіх пасеваў пад тэхнічнымі і іншымі культурамі і травамі. У адносінах жывёлагадоўлі лічбы таксама гавораць аб росьце стада на ўсіх асноўных групах (коні, буйная рагатая жывёла, авечкі, сьвіньні).

Апрача таго, рад іншых паказальнікаў гаворыць зусім не аб дэградацыі сельскае гаспадарцы, а аб разьвіцьці прагрэсыўных элементаў у гэтай галіне. Значныя посьпехі ў справе пераходу на шматпольле, рост зьвіклевага заворваньня, павялічэньне гатунковых пасеваў, забесьпячэньне сельска-гаспадарчымі машынамі, расваюсюджаньне мінеральных угнаеньняў і г. д.—усё гэта гаворыць аб разьвіцьці прагрэсыўных тэндэнцый у сельскай гаспадарцы.

Панікёрскія галашэньні аб дэградацыі сельскае гаспадаркі адлюстроўваюць настрої кулацтва, якое ня можа ня марыць аб зьняцьці савецкіх абмежаваньняў у адносінах росту капіталістычных элементаў вёскі. Усё, што сказана аб разьвіцьці сельскае гаспадаркі, сьведчыць разам з тым і аб тым, што пяпершы тэмп зо разьвіцьця ні ў якой меры ня можа адпавідаць інтарэсам правядзеньня шаркага тэмпу індустрыялізацыі краіны.

Цяжкасьці хлебазагатоўчых кампаній мінулага і гэтага году ставяць гэта пытаньне з вялікай вострасьцю. Мы павінны абавязкова дабіцца значнага палепшаньня ў гэтай справе. У зьвязку з гэтым, савецкая ўлада правяла і праводзіць рад буйных мерапрыёмстваў па зьвяжэньні як адзіваасабовых бядняцка-сераднякіх гаспадарак, так і па ўзмацненьні сацыялістычнага сэктару ў вёсцы. Вось асноўныя мерапрыёмствы, якія ўжо праведзены, але яшчэ стаяць на чарзе ў адносінах індывідуальнай сялянскай гаспадаркі.

*(Канец дакладу ў заўтрашнім нумары).*

*) Даклад дасецца скарочаным.

# Па беларускай ССР.

**(Ад нашых карэспандэнтаў).**

## Першы ў акрузе чырвоны абоз з хлебам.

**Калінкавічы, 27-2.** (Магіл. акр.). 20 лютага ў Калінкавічы прыбыў чырвоны абоз з хлебам з вёскі Сьвіроль, Гусарскага сельсавету. Было каля 25 падвод, якія здалі 150 пудоў хлеба.

Абоз урачыста быў спатканы пад музыку. У часе мітынгу, які прыцягнуў шмат народу (дзень быў базарны), былі чутны выгукі з боку сялян, каб загатоўчыя арганізацыі наладзілі выезды на вёску дзеля арганізацыі гэтых-жа абозаў.

— Даведайцеся да нас у Аўтухоўскі сельсавет,—кажа таварыш Марка Аўсяньвікаў,—я здам сваіх 10 п. хлеба.

Абоз арганізаваны ў вёсцы Сьвіроль пасьля праведзенае там загадчыкам мясцовага (клімавіцкага) пункту Саюзхлебу гутаркі пра значэньне загатовак.

Настрой сялянства на мітынгу і тая акалічнасьць, што абоз з'арганізаваны ў канцы зімы, калі хлеб ужо «падбіраецца», кажа за тое, што пры ўмове добрай растлумачальнай работы мы маглі-б мець не адзін гэткі абоз ужо ўвосень і ўзімку.

Да рэчы, сьвірольцы на сваім сходзе ўхвалілі і надалей здаваць зьлішкі хлеба арганізаваным парадкам.

## Рыхтуемся да 8-га сакавіка.

**Гомель, 27-2.** Распачата падрыхтоўка правядзеньня сьвяткаваньня 8-га сакавіка. На прадпрыёмствах у чырвоных куткох, клюбах, хатах-чытальнях праводзяцца гутаркі аб значэньні сьвяткаваньня 8-га сакавіка. На мясцох утвараюцца камісіі па праверцы вылучэньня жанчын на адказную працу, на ўдзяцньне жанчын у грамадзкія арганізацыі і інш.

На фабрыцы «Везувій» і на фабрыцы „Герой Труда" ў Добрушы адчыняюцца другія зьмены ў яслях. У Новабеліцы арганізуецца малочная кухня і адчыняецца дзіцячы пакой у клюбе «Везувій». У адным з буйных калгасаў акругі намячаецца адчыніць ясьлі.

Адначасова з гэтым у акрузе ўтворана камісія па правядзеньні культурна-бытавога паходу для выяўленьня ўсіх недахопаў ва ўстановах, якія абслугоўваюць бытавыя патрэбы работніц і сялянак для іх зьнішчэньня.

Будуць абсьледаваны школы, больніцы, ясьлі, хлебапякарні, інтэрнаты і інш. установы. У даным паходзе будзе ўдзельнічаць значны лік работніц і сялянак.

## Новы завод па апрацоўцы вапны.

**Гомель, 26 2.** *У акрузе праводзіцца абсьледваньне мястэчак з мэтаю гаспадарчага іх дабрабыту. Ужо скончана абсьледваньне мястэчка Чачэрск, дзе пастаноўлена пабудаваць вапняны завод з прадукцыйнасьцю ў першым годзе да 100 тысяч пудоў і давядзеньнем праз 2-3 гады да 300 тысяч пудоў.*

*На заводзе будзе працаваць бяднейшае насельніцтва мястэчка. Збытам прадукцыі завод забясьпечан. Значная частка прадукцыі будзе выкарыстана для будаўнічых работ, а частка вапны будзе выкарыстоўвацца для ўгнаеньня.*

*Завод будзе будавацца арцельлю пад кіраўніцтвам «Куст-прамсаюзу».*

## На сродкі самаабкладаньня адчынілі хату-чытальню.

**(Вёска Рабяткі, Расьнянскага р., Аршаншчына).**

Раней моладзь нашай вёскі праводзіла вечары зусім некультурна: сабраўшыся ў якой-небудзь хаце часта праводзіла час за картамі, скокамі і г. д.

Сёлета на сродкі самаабкладаньня ў нашай вёсцы адчынілася хата-чытальня. Кожны вечар камсамольцы праводзяць чытку газэт і розных гаспадарчых кніжак, наладжваюць культурныя вечары.

Зацікаўленасьць беспартыйнай масы ў працы, якая праводзіцца камсамольскай ячэйкай, вялікая, дзякуючы чаму добра наведваюцца хаты-чытальні ўсёй беспартыйнай масай. **С. Вясковы.**

## Глухі куток ужо мае школу.

**(Барэзінскі раён, Меншчына).**

Адзін з глухіх, далёка адкеглых, бедных і некультурных куткоў Беларусі гэта—вёска Дулебы і ваколічныя пасёлкі, што ўваходзяць у адзін Дулебскі сельсавет.

Вёска Дулебы па сваёй насёленасьці мае каля 700 жыхароў. Да рэвалюцыі ў гэтай вёсцы ледзь можна было знайсьці пісьменнага чалавека, а ўся маса сялянства заставалася цёмнай і непісьменнай, жывучы сярод сваіх дулебскіх лясоў.

І толькі рэвалюцыя абудзіла іх ад сну, яны скалынуліся, схамянуліся і пачалі цягнуцца да асьветы, ведаў і культуры. Тры гады назад згодна іх хадайніцтва быў аддадзен дом, дзе было лясьніцтва, пад школу.

У мінулым годзе гэта памяшканьне рамантавалася другі раз, на сродкі самаабкладаньня, рамонт зроблен канчатковы і цяпер сяляне ўсяго сельсавету маюць добра абсталяваную школу, што іх цешыць, надае ім бадзёрасьці і сілы.

Цяпер яны ўсьвядомілі значэньне асьветы і ня гледзячы на тое, што самі непісьменныя, яны з вялікаю ахвотаю пасылаюць сваіх дзяцей у школу. **Я. Марцынкевіч.**

## Заможнікі забілі каапэратара.

**Гомель, 27-II.** Нядаўна грамадзкасьць Гомельшчыны была абурана забойствам грамадзкага працаўніка—каапэратара, старшыні Бацунцкай малочнай арцелі т. Маслава.

Гэтая арцель пасьпяхова разьвівала сваю працу і пачала будаваць вытворчыя прадпрыёмствы.

Забойцы Маслава злоўлены. Яны аказаліся жыхарамі сяла Бацуні. Забойства яны ўчынілі з мэтаю пазбавіцца ад энэргічнага працаўніка.

Частка затрыманых належаць да заможных. Насельніцтва Бацуні і іншых селішчаў патрабуе суровага пакараньня забойцаў.

# Напярэдадні вясеньняй сяўбы.

## Як мы рыхтуемся да сяўбы.

**(Мсьціслаўскі раён).**

Падрыхтоўка да сяўбы пачалася з загатовак насеньня. Плянавыя заданні па ўсіх відах культур выкананы, за выключэньнем ячменю і канюшыны, загатоўка якой, лепш сказаць завоз, выканан ледзь на 30 проц. Мясцовыя загатоўкі канюшыны пакуль-што роўны нулю па прычыне амаль што поўнага неўраджаю насеньня канюшыны. Усё загатаванае насеньне ў тым ліку і лён зараз сартыруецца і па прыкладу мінулага году насельніцтву будзе выдадзена насеньне вышэйшай якасьці.

Сартыраваньне сялянскага насеньня робіцца на дзевяці зернаачышчальных пунктах, якім вызначан радыус абслугоўваньня. Некаторыя з гэтых пунктаў перасоўваюцца в мэтай набліжэньня да насельніцтва. Склад машын папоўнен пяцьцю новымі трыерамі, набытымі часткай за сродкі РВК, а часткай за сродкі самаабкладаньня.

**Да гэтага часу адсартавана 122 тоны рознага насеньня альбо 14 проц. плянавага заданьня.** Толькі ў савгас Лютня-Бобрыкі ўсё спакойна. Машыны не працуюць, а нават некаторыя з іх, як, напрыклад, льносартыроўка і зусім неадрамантаваны.

На вёсцы з удзелам агранома праведзена 36 сялянскіх сходаў, дзе абгавораны пытаньні мерапрыёмстваў па паляпшэньні ўраджайнасьці і разьвіцьці вытворчасьці сельскай гаспадаркі. Праведзеньне гэтых сходаў працягваецца і зараз. Гэтыя самыя пытаньні абгавораны на трох парадах раённага маштабу, на пленумах: райвыканкому, райкому КП(б)Б і камсамолу.

Ёсьць і сур'ёзныя перашкоды ў падрыхтоўчай працы. Так, вызначаны на пабудову кузьні-майстэрні крэдыт у суме 800 руб. дзесьці яшчэ ляжыць і арганізацыя кузьні не пачата. Сельсаветы ня толькі ня склалі ніякіх плянаў насеньняй кампаніі, а нават не падлічылі патрэбнай колькасьці насеньня, падлягаючага атрыманьню ад загатоўчых органаў.

А па лініі агранамаў ад акрэса паперы, паперы, паперы. Ды яно і зразумела, чаму гэта так: калі-ж ня пісаць, дык зусім і «працы» ня відаць будзе.

Калі дзён пяць не атрымоўваюць гэтай «літаратуры», а потым адразу атрымаць і стаць пераглядаць, дык само сабой успамінаецца нешта Сарачынскае:

«І чого чого тільки няма на тій армарцы!».

Між тым жывой дапамогі, якая абяцана, няма. Лепш было-б, чым пісаць паперы, праехаць у адно—другое мэзіарацыйнае таварыства ды растлумачыць, як атрымаць сена з попелу, якога ў нас толькі ў горадзе сабралася каля 15 тон.

**Агр. І Кр...ь.**

## Плян ламаецца.

**(Зеляноцкі с.-с., Калінкавіцкага р., Мазыршчына).**

*Для ачысткі насеньня нашаму сельсавету дадзен адзін трыер. Сельсавет склаў плян абслугоўваньня вёсак трыерам, але дзякуючы галавацяпству сяброў с-с. вёскі Убалаці трыер прастаяў там два тыдні бяз працы і ўжо плян парушаны.*

*Два тыдні сябры с-с. спрачаліся, хто з іх павінен стаяць каля машыны. Сяляне вёскі Гарочычы павінны былі забраць трыер з Убалаці, але ім ня далі і аставілі яшчэ на два тыдні.*

*Трэба сельсавету прыцягнуць галавацяпаў да адказнасьці за зрыў зернаачышчальнай кампаніі і дабіцца, каб сельсавету быў дан яшчэ адзін трыер і трашчотка для ачысткі насеньня лёну.*

**Лявонік В. Л.**

## З чым сустракаем веснавы сеў.

**(Рагачэўскі раён, Бабруйшчына).**

Адбылася нарада пры РВК па ўзьдыму ўраджайнасьці, на якой прысутнічалі старшыні сельсаветаў, навітэтаў сялянскае ўзаемапамогі, прадстаўнікі калгасаў, савгасаў, партыйных і камсамольскіх арганізацый, якая была пачаткам падрыхтоўкі да веснавога севу.

Нарада ўсебакова абмеркавала мерапрыёмствы падвышэньня ўраджайнасьці і ўхваліла наступнае:

Выканаць плян зернаачышчэньня, які складае 1364,22 тоны, скарыстаўшы для гэтае мэты машыны аграпункту, савгасаў, калгасаў, а крэдытным т-вам зараз-жа накіраваць абозы па сельсавету дзеля ачысткі, прымацаваўшы людзей, якія б сачылі за працай зернаачышчэньня.

Пратруціць насеньне дзеля зьнішчэньня сажы 11041 пуд.

Пашырыць пасэўную плошчу на 7 проц., шляхам распашкі ўсіх нераспаханых земляў і скарачэньня плошчы папару.

Сельсаветам і агранамі паставіць мэтай скарачэньне да мінімуму пасеву ў яравым палі, менш выгодных культур, як грачыхі, проса і пшаніцы, а павялічыць пасеў травасеяных, кораньплодаў, тэхнічных культур лёну і канаплі.

Крэдытным т-вы павінны своечасова падрыхтаваць насеньне бядняцка-сераднякам насельніцтву па заяўках сельсавету і камітэту ўзаемапамогі, якія і павінны быць прадстаўлены ў самы бліжэйшы тэрмін.

Абавязаць усіх культурнікаў, каб яны здалі насенны матар'ял у т-ва, для забясьпечаньня бедняты. Сетка шматпалёвых севазваротаў пашыраецца на 4170 гэктараў, на земляўпарадкаваемых выселках. Так як у мінулыя гады не хавіла штучнага ўгнаеньня, дык цяпер трэба ўжыць захады і завесьці 523 тоны рознага выгляду штучнага ўгнаеньня, адначасова правесьці належную працу на скарыстаньні попелу на ўгнаеньне, для чаго абвясьціць дзяржаўным установам зьбіраць попел, а таксама растлумачыць сялянству карыснасьць гэтага ўгнаеньня.

Усім савгасам і калгасам загадаць правесьці ўгнаеньне ня менш адного гэктара торфам, а агранамі даручыць закласьці як мага больш дэманстрацыйных вучастка ў.

Савгасы і калгасы павінны ня выходзіць з кола дзейнасьці агранамі, дамагаючыся, каб яны былі відавочнымі агітатарамі за калектывізацыю сельскай гаспадаркі, прапанаваць ім ужываць выключна радкоры насеў, якога-б то ні было насеньня.

Наогул нарада вызначыла цэлы шэраг мерапрыёмстваў, якія палком накіраваны на ажыцьцяўленьне пастановы ўраду аб узьдыме ўраджайнасьці.

**Я. Крушына.**

# ПЕРШЫ УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД ЖАНЧЫН КААПЭРАЦЫЙНАГА АКТЫВУ.

На ранішнім пасяджэньні 26 лютага зьезд абгаварыў даклад старшыні Белкаапсаюзу тав. Наўлянскага на тэму: **Гаспадарчае становішча БССР і чарговыя задачы спажывецкай каапэрацыі.**

З надзвычайнай увагай жанчыны-актывісткі выслухалі гэты даклад. Яшчэ ў часе дакладу дэлегаткі зьезду пачалі засыпаць прэзыдыум запіскамі. Мы рэдка бачылі такую актыўнасьць, якую праявілі жанчыны, але на тое яны, відаць, і актывісткі.

Дакладчыку пададзена больш 200 запісак і ў большасьці іх—па 5-8 пытаньняў. Адным словам, як мінімум дакладчыку зададзена каля 750 пытаньняў. Спрачкі па дакладу занялі частку ранішняга і ўсё вячэрняе пасяджэньне; пасьпела выказацца 32 чалав., а запісалася 65.

Прывесьці ўсе, нават найбольш цікавыя пытаньні, зразумела, ня хопіць месца, а таму мы абмяжуемся некалькімі.

— Якія выпікі дала чыстка каапэрацыйнага апарату і асабліва загатоўчага?

— Чаму, хто здае сыравіну, таму даюць тавары, а бедняку не даюць?

— Чаму ў прыватніка падашва ёсьць і ён дзярэ 3 скуры, а ў каапэрацыі няма?

— Што робіцца для зьнішчэньня антысанітарнага становішча крам на райёнах?

— Чаму дэфіцытныя тавары прыказчыкі ЦРК часам прадаюць прыватніку?

— Якім чынам будзе разьмяркоўвацца хлеб сярод сялянскай беднаты?

— Што зрабіць, каб ня было чаргі?

Цікавяцца дэлегаткі, чаму ў вас недахват прамтавараў, чаму чарга за газай і сольлю, якіх хапае на ўсіх. Адным словам, дэлегатак цікавяць пытаньні па ўсіх галінах працы нашай спажывецкай каапэрацыі.

На вячэрнім пасяджэньні з кароткай прамовай выступіў **сэкратар ЦК КП(б)Б тав. Васілевіч**, спатканы гучнымі воплескамі.

Тав. Васілевіч заклікаў дэлегатак разгарнуць на зьезьдзе здаровую крытыку—хібаў у працы спажывецкай каапэрацыі. Агульныя дасягненьні нам усім вядомы, а зараз трэба падрабязна разабраць усе тыя недарэчнасьці, якія ёсьць у працы каапэрацыі. Тав. Васілевіч адзначыў неабходнасьць разгарнуць працу па ўцягненьню жанчын у каапэрацыю і ў кіруючыя органы апошняй, а таксама на неабходнасьць каапэрацыі разгарнуць масавую культурную працу сярод пайшчыкаў.

Аб чым-жа гаварылі жанчыны ў спрэчках?

Папершае, адзначалі ўсё тое, што ў іх набалела, усё тое, што па іх думцы, трэба выправіць. Гаварылі ў спрэчках і аб працы каапэрацыі і аб пасяўной кампаніі, і аб падвышэньні ўраджайнасьці і г. д.

— Балючае пытаньне,—кажа адна з дэлегатак,—гэта тое, што каапэрацыі ад нас за 20-25 вёрст. Часта наша каап

# ЖЫЦЬЦЁ І ПРАЦА АСЬВЕТНІКА.

## Бяспрытульная сямігодка.

Горад Амсьціслаўль бурліць, шмат у каго неспакойна на сэрцы. З Менску прыехалі інспэктар РСІ т. Нікалаеў і інспэктар Наркамасьветы т. Аніхоўскі. Прыехалі яны да нас таму, што ў нас больш дрэннага, чымся добрага. Зьвярнулі яны вялікую ўвагу і на 5-ю сямігодку, якая лічыцца пры дзіцячым гарадку. А на яе патрэбна было зьвярнуць увагу, бо яна таксама бяспрытульна, як і значная частка тых вучняў, што вучацца тут.

Тав. Нікалаеў вылучыў для 5-й сямігодкі тры вечары, т. Аніхоўскі адзін. Набывалі на занятках. Затым два вечары адбывалася насяджэньне пэдрады і два вечары правёў на іх т. Нікалаеў.

„Школа вядзе працу без агульнага плану, адгэтуль адсутнічае ўвязка ў выкладаньні па асобных прадметах, вучот працы вядзецца на старому, няма аднак аб удзеле вучняў у школьным жыцьці, невядома, у чым выявілася іх самадзейнасьць. Ня відаць калектыўнай творчасьці вучняў. Некаторыя выкладчыкі ня зусім падрыхтаванымі прыходзяць на заняткі". Вось заўвагі, якія рабіў т. Нікалаеў у выніках свайго абгляду працы школы. Акруговы інспэктар асьветы т. Акулік дадаў са свайго боку: «слабае агульнае разьвіцьцё вучняў, яны таксама слаба ўцягнуты і ў па-зашкольную працу. Невыстарчальнае кіраўніцтва пэдагагічна-мэтадычным бокам школы з боку загадчыка».

Настаўнікі сямігодкі ўважліва адносяліся да пастаўленага пытаньня і ня супакоіліся на тым, аб чым казалі сябры камісіі. У прынятай рэзалюцыі яны адзначылі, што самі вельмі мала зрабілі для палепшаньня ўмоў школьнага жыцьця, што ня трымалі сувязі з выхавацелямі дзіцячага гарадку і не праводзілі насяджэньняў пэд. рад, каб калектыўна склясьці агульны план і разам яго выконваць. Тут-жа былі адзначаны і іншыя недахопы і перашкоды: холад у школьным будынку (тэмпэратура ў марозы ніжэй 0). дрэннае асьвятленьне, недахоп падручнікаў, слабая пасьпяховасьць выхаванцаў двіц. гар., нечарнальныя адносіны да школы адміністрацыі гарадку, бо ў гэту сямігодку яны накіроўвалі тых, хто адставаў у іншых школах ці выключаўся зусім.

Прадстаўніца выхавацеляў гарадка казала: „дзеці і ня любяць гэтай сямігодкі, ня хочуць ходзіць у яе, бо ўсе ўмовы, па іх думцы, тут дрэнныя".

Частка праўды тут ёсьць, бо холад і сумны выгляд пакояў у часе вячэрніх заняткаў і на настаўніках адбіваецца. Больш за ўсё адбіваецца на працы і на настроі вучняў тое, што няма ўласнага будынку, што ў вучняў няма ўласнага кутку ў школе, а таксама і тое, што адзін прадмет выкладаюць два і тры выкладчыкі, і таму вельмі цяжка кіраваць школай і пабудаваць агульны план.

Трэба, каб заняткі перавялі ў першую зьмену, каб далі будынак школе, трэба наладзіць выхаваўчую частку, утварыць цесную сувязь з выхавацелямі двіц. гарадку Загадзыку школы падыйсьці бліжэй да кіраўніцтва школай, не сачыць толькі за гаспадарчай часткай, больш увагі ўдзяліць пэдрадзе, а настаўнікам своечасова даваць планы справаздачы і таксама больш прыхільна адносіцца да пэдагагічных і мэтадычных спраў.

Толькі тады наладзіцца школьная праца. Мясцовым арганізацыям і інспэктару асьветы зьвярнуць большую ўвагу на школу, бо ранейшыя інспэктары Самуйлаў і Сарокін сваімі наводзінамі ўнасілі разлад у школу.

Архіпаў.

## Як Бабруйскі гарсавет кіруе асьветай.

З яўрэйскага дзіцячага дому № 2 за дрэнныя паводзіны звольнілі выхаванца. Звольнены, разумеецца, гэтым быў незадоволен і падаў скаргу ў гарсавет. Гарсавет для высьвятленьня справы складае камісію ў складзе: заг. асэнізацыйнага абозу, старшыні саюзу працаўнікоў камунальнай гаспадаркі і бібліятэкаршы.

Камісія правярае працу дзіцячага дому, выходзіць адтуль, складае акт, піша шэраг прапаноў і ў заключэньне прапануе зьняць з працы 2 выхавацельніц—і ў гарсавет. А гарсавет доўга ня думаючы выносіць пастанову аб звальненьні іх з працы.

Пачуўшы аб гэтым, выхавацельніцы бягуць да гарадзкога інспэктара Нарасьветы, у групком і акрпраўленьне працасьветы, у акрінспэктарыят з запытаньнем, за што іх зьнімаюць з працы. Але для ўсіх гэта—як сьнег на галаву: ніхто нічога ня ведае як аб агледзе працы дзетдому, так і аб пастанове аб звальненьні, бо аб расьследваньні заявы звольненага выхаванца ня быў паведамлен ні інспэктар Нарасьветы (хоць і працуе там-жа ў гарсавеце), ні саюз працасьветы.

Такім чынам гарсавет праз працаўнікоў асэнізацыйнага абозу і саюз працаўнікоў камгосу ўзяўся кіраваць дзіцячым домам.

Інспэктар Нарасьветы з гэтым звальненьнем, разумеецца, не згадзіўся, і выхавацельніцы працуюць на месцы.

Асьветнік.

## ЭКЗАМЕНЫ—ПЕРАЖЫТАК СТАРЫХ ЧАСОЎ.

(Менскі Белпэдтэхнікум).

У той час, калі вышэйшыя і сярэднія навучальныя ўстановы іншых саюзных рэспублік з самага пачатку свайго існаваньня адмовіліся ад непедагагічных прынцыпаў, будуюцца і працуюць па прынцыпах, пакладзеных камуністычнай партыяй у аснову пралетарскага выхаваньня моладзі, да гэтага часу на Беларусі мы яшчэ маем блытаную сыстэму экзаменаў у сярэдніх навучальных установах.

Бярэм да прыкладу пэдагагічныя тэхнікумы. Тут апроч таго, што заданьні па ўсіх дысцыплінах прыходзіцца здаваць кожны месяц, у канцы кожнага навучальнага году мы маем яшчэ так званыя „экзамены" па цэламу шэрагу дысцыплін. Напрыклад, у канцы другога году навучаньня мы маем экзамены на 13 дысцыплінах. Гэта значыць, у працягу якіх-небудзь паўтара месяца мучаюць студэнтаў.

Пачынаецца з таго, што некаторыя студэнты ўжо з самага пачатку навучальнага году, спадзяючыся на тое, што будуць экзамены, сыстэматычна перастаюць рыхтаваць заданьні, не здаюць іх. Ёсьць выпадкі, калі ў нашым тэхнікуме такім парадкам некаторыя студэнты ня здалі па 6-7 заданьняў.

— Пашто-ж рыхтаваць, усё роўна экзамены будуць, тады падрыхтуем,— кажуць яны.

На падрыхтоўку і здачу экзаменаў траціцца калі двух месяцаў навучальнага году, у той час, як за гэты тэрмін можна было-б прапрацаваць тойжа матар'ял куды з большай карысьцю.

Самі настаўнікі нашага тэхнікуму даводзяць, што экзамены ніякае рэальнае карысьці не даюць, бо тыя з студэнтаў, якія адставалі ў навучальным годзе, за адзін або два дні ня могуць папоўніць свае прабелы. Пры гэтым экзамены прыходзіцца здаваць за два гады. Такім чынам, цалкам адпадае думка аб тым, што нібыта студэнты ў часе экзаменаў могуць набыць веды.

Затым нэрвовасьць, бяссонныя ночы, блытаніна ў адказах—усё гэта ані не адпавядае ідэям камуністычнага выхаваньня новага чалавека.

Аб тым, што экзамены наогул ёсьць перажытак старой школы, гаварылася шмат у нашым друку, але, ня гледзячы на гэта, Наркамасьветы да гэтага часу падтрымлівае гэтую сыстэму экзаменаў.

Мы цалкам супроць гэтае старажытнае формы падагульваньня пройдзенага курсу. Аднак, мы не адкідаем думкі аб тым, што ў канцы навучальнага году патрэбна падагульняючая праца па замацаваньню пройдзенага. У гэтым мы цалкам згаджаемся з думкай некаторае часткі нашага настаўніцтва, якое кажа, што той час, які даремна траціцца на экзамены, трэба скарыстаць на паўтарэньне пройдзенага разам з настаўнікам, нармальным акадэмічным шляхам.

Мы просім Наркамасьветы як найхутчэй вырашыць гэта пытаньне, бо ўпэўнены, што яно хвалюе студэнцтва і іншых пэдагагічных тэхнікумаў Беларусі.

Мы ўпэўнены, што калі экзамены будуць адкінуты, студэнты будуць стала рыхтавацца да здачы месячных заданьняў, бо ад гэтага будзе залежаць пераход іх на наступны курс.

СТУДЭНТЫ МЕНСКАГА БЕЛПЭДТЭХНІКУМУ.

(250 подпісаў).

## Газэта і кніга—праз школу ў масы.

Мы пойдзем наперад па шляху культурнай рэвалюцыі на вёсцы в большым посьпехам, калі як найбольш прасунем у гушчы сялянства кніг і газэт. Гэта справа ўсіх, але першае месца сярод шэрагу арганізацый вёскі павінна заняць школа.

Цікава прасачыць—як вырашае гэта пытаньне Насовіцкая школа.

У 1924-м годзе на дзьве вёскі Карма і Насовічы па 315 двароў ішло 2 газэты і то старшыні с-савету. Пры кааперацыі была бібліятэчка паліт-лістовак у 40 штук. Бачачы гэту хваробу, прыналягла на яе наша школа, разам з малышамі школьнікамі.

І вось вынікі: У 1925 годзе на люты м-ц было ужо 19 газэт, у 1926 г. 57 газэт, у 1927 г.—74 газ. 1928 г.—117 газэт і зараз у лютым выпісваецца газэт і часопісаў 159, або больш як на два двары газэта. Выпісваецца 74 экз. «Крестьянской Газеты» 37 «Бел. Веска», 18 розных часопісаў і 30 іншых розных газэт. Пашырана значна бібліятэка: ёсьць да 80 розных паліт., с.-гаспад. і настаўніцкіх кніжак і больш 150 розных часопісаў.

Дзеці вучацца, любяць і чытаць газэту са школы. Кожны тыдзень адведзена газэтная гадзіна, калі вучні чытаюць газэту, пішуць у яе заметкі, ладзяць пасьцengазэту (за 4 гады выпушчана 12 школьных пасьцengазэт і 14 газэт вёскі і селькоргуртка). У гэты-ж час пішуцца лісты ў іншыя школы дзеля сувязі і чытаюцца атрыманыя адтуль. У гэтым годзе паслана ад усёй школы, як калектыву, 9 заметак-лістоў у газэты і часопісі, 2 лісты ва межы СССР і 16 лістоў у розныя блізкія і далёкія (Мурманск, Якутск,) куткі СССР. Да рэчы: гэткая перапіска з розными школамі вельмі карысна, з вялікім удзымам пішуцца лісты, чытаюцца адказы і вельмі добра і надоўга дзеці запамінаюць апісаньне жыцьця, прыроды, заняткаў і г. д. Так, у мінулым годзе школа атрымала лісты з Алдану, Каралака на Каспі, Сталіна, Ялты і г. д., і зараз дзеці добра могуць расказаць пра горы, здабычу золата, пра мора і лоўлю рыбы, пра здабычу вугалю і жыцьцё рудакопа і г. д.

Падпіска выбіраецца настаўнікам і старшымі дзецьмі. Уся пошта прыносіцца ў школу і дзеці яе разносяць па хатах селянам.

Так з малых гадоў, навучаючы дзяцей любіць кнігу і газэту, а праз дзяцей навучаючы і бацькоў, мы здужаем цэмру.

В. А. Сяргейчык.

## Грамадзка-карысная праца ў застоі.

(Плешчаніцкі р., Менскай акругі).

Абсьледваньне часткі школ і пэдрадаў паказала, што за гэтага часу грамадзка-карысную працу школы нідзе стыхійна. Са ўсіх пэдрадаў райёну толькі адна (Крайская) абгаварвала і намячала планы працы. Кіраўнікі пэдрадаў і загадчыкі школ не знайшлі зьместу працы і формаў арганізацыі. Вучоту нават стыхійна праробленай працы ня было.

У абгаварэньне правядзімай працы і ў самую працу вучні ня ўцягнуты.

Кіраўнікі, як відаць, ня ўлічвалі—чым вайкаўдева савецкая грамадзкасьць, якія задачы партыі трэба ажыцьцявіць на месцах.

Возьмем сучасны момант. Партыя і ўрад накіравалі ўсе сілы і сродкі дзеля масьпяховага правядзеньня вясенняй сяўбы, узьдыму ўраджаю, калектывізацыі ў сельскай гаспадарцы і г. д.

Трэба школам скласьці планы грамадзка-карысной працы ў гэтай галіне, абгаварыць іх на вучнёўскіх сходах, каб упягнуць іх у гэту працу, даць заданьні пасобным вучням, а лепш—калектыву вучняў. Да вясны можна пасьпець зрабіць наступнае: а) арганізаваць збор вопелу вучнямі дома і ў школе, б) падрыхтаваць да закладкі на школьным вучастку паказальных пасеваў на штучным угнаеньні і на попеле, в) правесьці агітацыю за пераход бацькоў вучняў ад працы сахой да плугу, г) запяцца наогул ліквідацыяй агранамічнай несьведамасьці сялян.

Вутэлін.

## НАМ АДКАЗВАЮЦЬ.

На допіс «А вучні хварэюць» („Сав. Бел." № 288 за 13-XII-28 г.) загадчык Халоневіцкай райбольніцы дае тлумачэньне, што пасьля мэтадычнага агляду вучняў Стаўбцоўскай школы сярод іх запраўды аказалася шмат хворых трахомай, нарастай і фавозам. Менская акр. інспэкцыя аховы здароўя дала загад халоневіцкаму райённаму ўрачу аб ізяляцыі і лячэньні хворых дзяцей.

На допіс «Шчасьліўцы і нешчасьліўцы» («Савецкая Беларусь» № 266 (2454) за 20 лістапада 1928 г.) Інспэктура на Сацыяльнаму Выхаваньню НКА паведамляе, што з дасьледваньня па гэтай карэспандэнцыі выявілася наступнае: 1) пры прызначэньні Пігулеваў на пасаду нічога пратэкцыянізму дапушчана ня было. Пігулева прызначана настаўніцай як моўная на гэта поўнае права: яна скончыла школу II ступені і праслухала настаўніцкія курсы на перападрыхтоўцы настаўнікаў, і прызначэньне гэту зяліло ня ўсіх, расьвіла, а вярнулася не райённы інспэктар, а акруговы інспэктарыят нарасьветы; 2) Траскоўская прызначана настаўніцай як скончыўшая школу II ступені, праслухаўшая настаўніцкія курсы і прапрацаваўшая адны год у школе практыкантай, дзе сябе выявіла ў працы; прычым Траскоўская прызначана ня ў першую чаргу, а яна прызначана толькі 10 лістапада з прычыны адсутнасьці іншых настаўнікаў; 3) Шуродзькова скончыла 2-гігодку, летнія настаўніцкія курсы і два гады вяла працу па ліквідацыі непісьменнасьці, што дало добрыя вынікі. Яна была часова прызначана з 1 настаўнічай, але, за адсутнасьцю іншых настаўнікаў, яна засталася працаваць. 4) З малодых настаўнікаў, праслухаўшых настаўніцкія курсы, не атрымалі месцаў па Дубровенскаму райёну Курносава і Дударова і толькі затым, што яны займаліся гандлем на рынку, дзе вялі сябе вельмі разьвязана і дрэнна, а таксама яшчэ не працавалі на культурна-асьветнай справе.

## Наша перапіска.

Махнячу, Луніну, Серафімовічу.—Мошчыцкаўль. Ваш ліст не дае ніякага тлумачэньня наконт допісу «Ганебны выпад супроць настаўніцы». Гэты допіс яні не замазвае ніясавай сутнасьці справы інстытуту глухаманых, а толькі адзначае нетактычнасьць з боку камісіі па высьвятленьні шкодніцтва ў інстытуце.

Асьветніку.—Менск. Допіс «Чым гэта тлумачыцца» пераслалі ў Бабруйскі акр. інспэктарыят нар. асьветы.

А. А—ны.—Магілеўшчына. На ваш допіс „Вось гэта асьветнік" Чачэвіцкі райвыканком дае тлумачэньне, што з боку настаўніка П. запраўды былі выхадкі нетактычных адносін да вучняў. Настаўніку П. абвешчана папярэджаньне.

Ш. Зіновічу.—Хатлянская школа. Вашу заяву пераслалі ў ЦП саюзу працасьветы.

Вір.—Вузьдзенскі р. Допіс „Людзі старога гарту" пераслалі ў ЦП саюзу працасьветы.

# У Прэзыдыуме Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.

23 лютага 1929 г. пад старшынствам тав. А. Г. Чарвякова Гадыўся чарговае пасяджэньне Прэзыдыуму ЦВК БССР. Разам з іншымі разгледжаны наступныя пытаньні:

### АБ ДЗЕЙНАСЬЦІ ЦЭНТРАЛЬНАЙ КАМІСІІ ДАПАМОГІ ДЗЕЦЯМ.

Заслухан даклад т. Будзіна аб дзейнасьці Цэнтральнай Камісіі Дапамогі Дзецям пры ЦВК БССР за перыяд з 1-X 1927 г. па 1-X 1928 г.

Асноўнымі задачамі ў рабоце Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі за мінулы год былі:

а) ліквідацыя вуліччнай дзіцячай бяспрытульнасьці згодна пастановаў дырэктыўных органаў;

б) упягненьне грамадзкасьці ў справу барацьбы з дзіцячай бяспрытульнасьцю.

Галоўную масу вуліччных бяспрытульных у БССР складаюць бяспрытульныя гастралёры, якія прыяжджаюць з іншых саюзных рэспублік. Так, напрыклад, на адным Гомелю за мінулы год зьнята з транспарту звыш 200 дзяцей.

Другая група бяспрытульных гэта з вёскі і мястэчак, якія дзякуючы слабай рабоце мясцовых органаў, сельсаветаў, гарсавеў і інш. у справе іх упарадкаваньня на работу, альбо ў дзіцячыя дамы, ідуць у горад і папаўняюць кадры вуліччных бяспрытульных.

З мэтаю ўцягненьня шырокай савецкай грамадзкасьці ў справу барацьбы з дзіцячай бяспрытульнасьцю, збору сродкаў, падбору вуліччных бяспрытульных, агляду стану дзіцячых дамоў, у жніўні м-цы мінулага году быў праведзен месячнік дапамогі бяспрытульным. У часе гэтага месячніка былі праведзены на сходах рабочых, сялян і служачых даклады аб барацьбе з бяспрытульнасьцю, арганізаваны ячэйкі т-ва „Прыхільнік Дзяцей", налабрана каля 500 бяспрытульных дзяцей, сабрана каля 40000 рублёў грошай.

Цэнтральная Камісія паставіла задачу наладзіць навуковае вывучэньне бяспрытульных дзяцей; з гэтай мэтай быў адзначены ў г. Барысаве дом для непаўналетніх прававарушнікаў на 100 чал. (Рэфарматорыум). Пры ім маюцца майстэрні, школа і клюб.

За мінулы год камісіямі, дапамогі дзецям і т-вамі «Прыхільнік Дзяцей» на барацьбу з бяспрытульнасьцю расходавана 823000 рублёў., з іх акругамі здабыта і расходавана 439000 руб.

На ўтрыманьні дзіцячых камісій у 1927-28 г. знаходзілася і знаходзіцца зараз 21 дзіцячая ўстанова, у якіх ёсьць 2100 дзяцей; у 1926-27 г. на ўстановах дзіцячых камісій было 1320 дзяцей.

З галоўных устаноў зьяўляюцца наступныя:

Тры дзіцячыя калоніі—360 дзяцей (Віцебск, Гомель і Магілеў), тры прыёмнікі—140 дзяцей (Полацак, Ворша, Гомель), чатыры дзіцячыя сталоўкі—740 дзяцей (Віцебск, Магілеў, Гомель, Менск), сем майстэрняў—405 дзяцей і г. д. Усяго за мінулы год дзіцячымі камісіямі і т-вамі „Прыхільнік Дзяцей" абслужана звыш 10 тысяч дзяцей, у 1926-27 г.—каля 4000. Вялікая колькасьць бяспрытульных упарадкавана на працу. Прычым трэба адзначыць, што органы Наркампрацы на мясцох вельмі дрэнна адносяцца да гэтае справы. 50 проц. броні, згодна пастановы СНК для нерароствкаў дзіцячых дамоў, не прадстаўляецца; ёсьць факты, напр., у Воршы з 180 падростваў дзіцячых дамоў пасланы на працу толькі 8-10 чал.

Сродкі дзіцячых камісій здабываюць ад гандлёвых і прамысловых прадпрыёмстваў і грамадзкім парадкам шляхам правядзеньня розных мерапрыёмстваў. Але з прычыны таго, што магазыны дзіцячых камісій ня ўключаны ў плянавае снабжэньне тавамі, гэтыя прыбыткі скарачаюцца. Таксама вельмі гостра абстаіць пытаньне з снабжэньнем майстэрняў сыр'ём і скурта-варамі, пражай для трыкатажных майстэрняў і г. д.

Дзіцячыя дамы Наркамасьветы БССР, з прычыны таго, што яны знаходзяцца ў цяжкім матар'яльным становішчы, таксама зьяўляюцца частковa пастаўшчыкамі бяспрытульных дзяцей, бо з іх пэўны процант выхававанаў упякае.

Асабліва гостра абстаіць справа працоўнага выхаваньня ў дзіцячых дамох: не хапае абмундыраваньня (на адного выхаванца адпушчаецца ўсяго 30 руб. на год), мала пасьбельных прылад, слабая матар'яльная забясьпечанасьць выхавацеляў, іх слабая кваліфікацыя і г. д.

Трэба заняцца пытаньнем рэарганізацыі дзіцячых дамоў, разбуйненьнем вялікіх дзіцячых дамоў.

Савецкая грамадзкасьць павінна праз арганізацыі т-ваў „Прыхільнік Дзяцей" трымаць сувязь з дзіцячымі дамамі, дапамагаць ім у рабоце. Неабходна таксама пашырэньне сеткі дзіцячых дамоў.

Трэба сказаць, што праца сярод дзяцей наогул пастаўлена вельмі дрэнна, дзякуючы чаму ў сучасны момант ёсьць выпадкі ўцёкаў дзяцей ад бацькоў, далучэньне іх да бяспрытульных і шэраг іншых цьяў, якія калечаць дзяцей.

Па лініі дашкольнага выхаваньня ў нас ахоплена толькі 3,77 проц. усіх дзяцей. К канцу пяцігодзьдзя маркуецца пропаст ахопу дзяцей дашкольнымі ўстановамі павялічыць толькі к 1932-33 г. на 2 проц.

У гэтым напрамку савецкая грамадзкасьць можа адыграць вялікую ролю, асабліва жанкі, кааперацыі і г. д.

Па дакладу разгарнуліся спрэчкі, у якіх выказаліся т. т. Дайнэка, Масальскі, Вараўка, Васілевіч, Захарава, Хвалевіч, Платуя.

Для распрацоўкі праэкту пастановы на заслуханаму дакладу Прэзыдыум ЦВК пастанавіў утварыць камісію пад старшынствам т. Платуна ў складзе т. т. Масальскага, Будзіна, Захаравай і Дайнэка.

### АБ ЧЛЕНАХ І КАНДЫДАТАХ У ЧЛЕНЫ ПРЭЗЫДЫУМУ ЦВК БССР.

Зацьверджана пастанова ЦВК і СНК БССР пра ўвекавечаньне памяці ахвяр грамадзянскай вайны. Згодна гэтай пастановы, дзень вызваленьня БССР ад белапалякаў—11 ліпеня прызнан днём успаміну ахвяр грамадзянскай вайны. Райвыканкомам, гарадзкім, местачковым і сельскім саветам даручана: прыняць меры да выяўленьня ўсіх могілак ахвяр грамадзянскай вайны, прывесьці іх у належны парадак, ушанаваць дзень сьмерці ахвяр грамадзянскай вайны вечарамі ўспаміну, назвамі іх іменьнямі вуліц, паселішч, устаноў і г. д.

### ПАЛАЖЭНЬНЕ ПРА ВСНГ БССР.

Зацьверджана палажэньне пра Вышэйшы Савет Народнае Гаспадаркі БССР. У новым палажэньні прадугледжаны ўсе тыя зьмены, якія адбыліся ў структуры і функцыях ВСНГ, у зьвязку з рацыналізацыяй савецкага апарату, а таксама больш дакладна вызначаны функцыі ВСНГ у адносінах мясцовай прамысловасьці.

### АБ АРГАНІЗАЦЫІ АКОПСКАГА НАЦСАВЕТУ.

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў задаволіць хадайнічаньне Мазырскага Акруговага Выканаўчага Камітэту і арганізаваць у Нараўлянскім райёне, Акопскі украінскі навыявальны сельскі савет.

# ПРАВОДЗІМ КОНКУРС.

## УЗОРНЫ СЕЛЬСКІ САВЕТ.

(Навасельскі сельсавет, Магілеўскага р.).

Добрым і моцным памоцнікам у працы сельсавету зьяўляецца працаздольны актыў, сярод якога ёсьць і жанчыны.

Праца сельсавету праводзілася шляхам.

Пленум зьбіраўся таксама і на вёсках. Яўка сяброў сельсавету і актыву 98,8 проц. Пытаньні разглядаліся жыцьцёвыя, якія народзяць усебакова абгаварваліся актывам і грамадзкасьцю.

Беднота згуртоўвалася над кіраўніцтвам сельсавету. На сходах абгаварваліся буйнейшыя практычныя пытаньні, якія закранаілі інтарэсы беднаты, дагаварваліся аб супольных выступленьнях, супольных дзеяньнях.

Шчыры ўдзел жанчын у правядзіных кампаніях і гурткох сьведчыць аб тым, што і сярод іх праведзена сельсаветам вялізарная праца. Моладзь заволічных вёсак таксама згуртавана каля сельсавету і заўсёды гатова дапамагчы яму ў працы.

Сельсаветам падрыхтоўваўся грунт для калектывізацыі насельніцтва. Дзякуючы шчыраму ўдзелу сельсавету ў гэтым напрамку, утварыўся моцны калектыў, які лічыцца самым аграмадным у акрузе.

Сельсаветам зьвернута шмат увагі на мерапрыёмствы для разьвіцьця кааперацыі. Сельсавет зрабіў сабе ў гэтым падпору з батракоў, беднякоў і сераднякоў. Ён на дабраахвотных пачатках сабраў паявых узносаў 1000 р. і адчыніў кааперацыйнае аддзяленьне. Па агульнаму ліку насельніцтва кааперавана 51,4 проц.

Сельсавет сурова прытрымліваўся клясавай лініі і наогул сувязь з насельніцтвам вёў сьціла. Усе кампаніі па сельсавету праводзіліся здавальняючa. Сродкаў ад самаабкладаньня сабрана 919 р. 53 к., якія скарыстованы на пабудову пажарнага складу, дзьвёх пунь пры школах і рамонт дарог і мастоў у межах сельсавету, за што сяляне на агульным сходзе вынесьлі вялікую падзяку.

Па сельска-гаспадарчаму падатку і страхоўцы, па складзенай райённай сводцы, савет лічыўся на першым месцы. Па рэалізацыі 2-й пазыкі індустрыялізацыі рэалізавана 115 проц. Камітэт узаемадапамогі працуе здавальняюча.

Навасельскі сельсавет сярод насельніцтва карыстаецца вялізарным аўтарытэтам. Скаргаў на бюракратызм і валакіту ня было. Сяляне на свае запытаньні хутка атрымоўвала належныя адказы. Сельк. М. С. Б. І. Гіро

## Наш сельсавет працаваў дрэнна.

(Зеляноцкі с.-с., Калінізвіцкага р., Мазыршчына).

### ПРАЦАВАЎ ТОЛЬКІ ПРЭЗЫДЫУМ.

Наш сельсавет абслугоўвае пяць буйных вёсак і некалькі адзельных хутароў разам 1056 гаспадарак. Сельскі савет складаўся з 25 чалавек—сяброў, у ліку якіх было 6 жанчын. Хаця і плян працы ў сельсавеце быў, але можна лічыць, што праца вялася з вялікімі адступленьнямі ад плану, а можа і без пляну.

Калі разглядзець працу Зеляноцкага сельсавету, то неабходна адзначыць, што працавалі актыўна толькі прэзыдыум сельсавету, а астатнія сябры сельсавету амаль што зусім ня цікавіліся працай с.-с., а некаторыя сябры сельсавету і зусім не наведвалі пленумаў сельсавету. Былі выпадкі, што адбываўся пленум с.-с., на якім ня было і адной трэцяй часткі сяброў сельсавету.

Прэзыдыум сельсавету пісаў надзвычайна строгія паперкі старшым сябрам па вёсках аб яўды сяброў на пленумы, але ні разу не запытаў тлумачэньня аб прычынах яўкі і строгія паперкі загубілі сваю моц.

Кажуць, што ў часе выбараў сельсавету былі сканструіраваны камісіі пры с.-с., але ў пратаколах гэтага ня было, а пагэтаму з першых дзён яны загінулі і на працягу двух год не працавалі.

### ГАСПАДАРЧАЯ РАБОТА СЕЛЬСАВЕТУ.

За два гады працы сельсавету трэба адзначыць вялікую працу ў адносінах пабудовы мастоў і дарог мясцовага значэньня.

Маецца вялікая пяга сялянства да лепшых форм землякарыстаньня і дзякуючы гэтаму, а таксама і ўвазе сельсавету, на тэрыторыі сельсавету арганізавалася два пасёлкі і адзін калгас.

Сродкаў самаабкладаньня па сельсавету сабрана каля 2000 р. За гэтыя сродкі дабудавана школа ў вёсцы Зеляноча, абгароджана школа і зроблен калодзеж у вёсцы Гарочыцы, куплен бык і пажінвэнтар у в. Насовічы. Скарыстаньне сродкаў самаабкладаньня было нерацыянальнае і часта безгаспадарчае.

У адносінах разьмеркаваньняў падатковых цяжкасьцяў і палёгак, за сельсаветам маюцца, нават, крымінальныя грахі, што падкрасьлівалася і на справаздачных сходах. Частка заможнікаў не плаціла таго, што трэба было плаціць. Скідачны фонд разьмяркоўваўся ў 1928 годзе неправідлова, а прадстаўленьне скідкі па страхоўцы рабілася самім старшынёю КСУ і з парушэньнем законадаўства.

Разьмеркаваньне лесу дарэмнага і крэдытнага было зроблена дрэнна і з гэтай прычыны многія адпушчанага лесу не скарысталі і па сканчэньні тэрміну яго раскупілі па спраўках с.-с. заможныя. Беднае ня была аказана дапамога.

### НЯ ЦІКАВІЛІСЯ СПРАВАЙ ПАДНЯЦЬЦЯ ЎРАДЖАЙНАСЬЦІ.

У справе падняцьця ўраджайнасьці сельсавет ня прымаў належных мер і з гэтай прычыны ня было магчымасьці ачысьціць насеньне. Сяляне вазілі чысьціць насеньне за 10 вёрст.

Настаўніцтва ня было ўцягнута ў працу сельсавету як культурная сіла і з гэтай прычыны школы не падрыхтаваліся да заняткаў як сьлед, а ў некаторых мясцох, нават, ня быў зроблен бягучы рамонт памяшканьняў. Школьныя дзялянкі ў большасьці здаваліся ў арэнду і толькі дзялянка Насовіцкай школы, хаб настаўнік працуе некалькі год, апрацоўвала дзялянку сама і яна мела паказальны характар.

Разьмяшчэньне другой пазыкі індустрыялізацыі сярод сялянства па сельсавету праведзена больш-менш здавальняюча, але гэты посьпех нельга аднесьці да сельчавету, бо сельсавет у гэтай справе быў пасыўны і нават сёньня ня мае лічбовых даных аб распаўсюджанай пазыцы, а толькі карыстаецца данымі РВК.

### ДРЭННА ПАДРЫХТАВАЛІСЯ ДА ПЕРАВЫБАРАЎ.

Справаздач устаноў, разьмешчаных на тэрыторыі с-с., сельсавет не заслухоўваў і з гэтай прычыны калі месца цераніна, бюракратызм і інш.

Падрыхтоўка да перавыбараў сельсавету з боку сельсавету была слабая. Былі выпадкі, калі позвы былі ўручаны пазбаўленым права голасу, а ў другім месцы многія зусім не атрымалі позвы і толькі выпадкова папалі на перавыборчыя сходы.

Позвы выпісваліся тым асобам, якія ўжо сем год як памёрлі, а 19-гадовыя хлопцы позваў не атрымалі.

Справаздачная кампанія сельсавету была бурная. Сяляне не хавалі каміня, як кажуць, за пазухай, а ўсё што было дрэннага вылілі на верх.

Лавонік В. Л.

# ПАКУЛЬ ШТО ЗРОБЛЕНА МАЛА.

*(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).*

### КАМПАНІЮ СУСТРЭЛІ ПАСЯДЖЭНЬНЯМІ.

Каб сустрэць падрыхтавана вясну, штодзённа ў Талочыне пачала засяджаць пасеўная пяцёрка. Засядаць і не накідаць ніякіх помінкаў—не ў натуры сучасных людзей. Пачала выпушчацца прадукцыя—дырэктывы, адносіны, загады, прапановы, парады, планы.

Праўда, загады і дырэктывы даваць амаль што няма каму—тэрыторыю ланцем зайнеш, размахнуцца няма дзе, і за невыкананьне—віны на стрэлачніка ня скінеш, а пагэтаму яны парашылі толькі плянаваць.

Сельсаветчыкі людзі жвавыя, і таму дзеля барацьбы з бюракратызмам і папяровым голадам планы пачалі пісаць на словах...

«От і неабходна нам ачысьціць насеньне на сто процантаў, калектывізаваць сельскую гаспадарку і індустрыялізаваць пакуль яшчэ адсталую краіну. А ў далейшым мы павінны накіраваць максымум увагі на выкананьне мінімуму агранамічных мерапрыёмстваў па ўзьвышэньню ўраджайнасьці нашых палёў.»

### ЗА ПЛЯНАМІ НЯ ВІДАЦЬ ЖЫВОЙ СПРАВЫ.

Такі «плянуючы настрой» асабліва выявіўся на пашыраным пленуме райвыканкому з удзелам усіх старшынь сельсаветаў, камітэтаў узаемадапамогі, старшынь і загадчыкаў райённых устаноў. Пасьля ўдзела пабудаванага дакладу акруговага агранома Кірпічнікава і шэрагу канкрэтна практычных прапаноў па ўзьвышэньні ўраджайнасьці і правядзеньню пасеўнай кампаніі, вялікая колькасьць выступаўшых «плянавала» аб вялікіх, грандыёзных, вялізарных, а не аб маленькіх і прыкметных па першы погляд і разам з тым карысных, неабходных.

За гэтымі «плянуючымі» разнававі схавалася ледзь-ледзь прыкрытая непадрыхтаванасьць да вясны.

На ўсяму райёну ачышчана 20 проц. насеньня. Некаторыя сельсаветы (і гэткіх большасьць), яшчэ толькі «варушацца» і «пішуць» пляны на словах. Шэсьць перасовачных абозаў і тры стацыянарныя пункты працуюць з перабоямі. Ёсьць весткі, што частка машын «гастралюе» па вёсках: прывязуць іх, паглядзяць, памацуюць рукамі і... ні кілёграма не даюць для ачысткі. Такія выпадкі назіраюцца ў Саколінскім сельсавеце. Нават сам старшыня з сакратаром ня ведаюць, дзе знаходзяцца ў гэты момант машыны.—Працуюць на вёсках... ачышчаюць насеньне... А дзе яны, колькі ачышчана насеньня, як яны скарыстоўваюцца—сельсавет ня ведае.

### КААПЭРАЦЫЯ НАСЕНЬКЯ НЕ АЧЫШЧАЕ.

Прыклад усяму гэтаму дае тая-ж талачынская кааперацыя: на яе складах на сёньняшні дзень ляжыць 4000 пудоў неачышчанага насеньня. Цёмны пякультурны селянін, які ня ведае ні „а", ні «бэ» ў агранамічнай навуцы, з дакорам адказвае райвыканкомаўцам на агітацыю ачышчаць насеньне.

— Вы думаеце, што мы дурні? Чаму-ж кааперацыя не ачышчае насеньня? Чаму вы іх не паддурыце?

І райвыканкомаўцы, лынаючы вачыма, вінавата «растлумачваюць», што кааперацыя «маласьведомы элемэнт» і прыкладу з яе ня трэба браць.

### БУДЗЕМ СЕЯЦЬ... ЗАСЬМЕЧАНЫМ НАСЕНЬНЕМ.

А талачынская агранамія ўпарта даводзіць, што авёс засьмечан на 50 проц. «аўсюком», і што калі такое насеньне будзе высеяна, дык можна рызыкаваць стопроцантным засьмечаньнем збожжа. На трагічную сыгналізацыю агранома ў кансэрватары сельсаветы адказваюць яшчэ большым адрывам ад жывой справы, яшчэ больш вялікім закапваньнем у горы папер. Праўда, пра члена сельсавету вёскі Халопкавічы гэтага нельга сказаць, бо ў яго вёсцы замест вызначаных 300 тон ачышчана 450, што дасягнута ўмелай растлумачальнай прапагандай, абходам двароў і шэрагам тэхнічна-арганізацыйных мерапрыёмстваў, але ўсе астатнія

# Пастанова калегіі НК РСІ БССР ад 6-XII 1928 г.

## аб прыёме і абслугоўваньні наведвальнікаў ва ўстановах БССР

1. Пя гледзячы на зусім дакладныя і катэгарычныя дырэктывы партыі і Савецкага ўраду аб палепшаньні прыёму наведвальнікаў, іх абслугоўваньня і паскарэньня разгляду спраў працоўных,—да гэтых пор пытаньні прыёму і абслугоўваньня працоўных у савецкіх установах не ўпарадкаваны. З аднаго боку, ніводная ўстанова не гарантуе наведвальніку дакладнага часу прыёму, а з другога—увага да пытаньняў асабістай уласьцівасьці не займае першарадзага мейсца ў рабоце ўстаноў, што выклікае неабходнасьць шматлікага хаджэньня працоўных па ўстановах і доўгую цягавіну ў разьвязаньні іх спраў.

2. Гэтак сама вельмі нездавальняча пастаўлена справа па абслугоўваньню наведвальнікаў і зваротку з імі з боку супрацоўнікаў, пры чым як партыйным, так і прафесыйным ячэйкі не ўдзялялі гэтым пытаньням вялкай увагі, у выніку чаго ўсё яшчэ наглядаюцца паасобныя выпадкі грубага ці зьневажальнага зваротку з працоўнымі. Але і наогул, хаця зваротак на форме часта бывае далікатны, на сутнасьці ён ня можа здавольваць працоўных, бо ў большасьці выпадкаў замест яснага, разумнага і вычарпаючага растлумачэньня супрацоўнікі ўстаноў абмяжоўваюцца вельмі фармальнымі адказамі. Наўважлівасьць да працоўных ва ўстановах выказваецца ў тым, што не арганізавана пісьмовая дапамога пэпісьменным, і ў тым, што ў установах яма нямых справак па шэрагу арганізацыйных пытаньняў і ў тым, што ў некаторых установах наведвальнікам кама на чым сядзець, і ў тым, што ўстановы ня цікавяцца скаргамі ці заўвагамі на непаладкі ў рабоце і ў зваротку супрацоўнікаў. Не заведзены кнігі скаргаў, ні скрынкі для заяў.

У разьвіцьцё дырэктыў партыі і Савецкага ўраду, з мэтай рашучага вынішчэньня дагаліны і зьневажальных адносін да працоўных і іх спраў і ў мэтах арганізацыі лепшага абслугоўваньня працоўных,—прапанаваць усім установам выканаць наступныя мерапрыёмствы:

1. Даручыць акрвыканкомам, разам з гарсаветамі, РСІ і прафесыйнымі саюзамі абгаварыць мэтазгоднасьць і магчымасьць пераводу некаторых гарадзкіх устаноў (камгас, гарсавет, нарсуды, ЦРК і т. п.) поўнасьцю на вячэрнюю работу ў 2-3 дні ў тыдзень.

2. Тым установам, якія па роду сваёй дзейнасьці маюць шырокі кантынгент наведвальнікаў з рабочай масы, як Пракуратура, РСІ, камгас, органы працы, страхкасы і т. д.,—час ад часу практыкаваць пасылку адказных працаўнікоў для дзяжурстваў на больш буйных прадпрыёмствах (у мэтах здаволеньня запросаў рабочых непасрэдна на прадпрыёмстве).

Удасканаленьне і дэталізацыю гэтага пытаньня дапасавана да канкрэтных асабліва сьцяў кожнага гораду ўскласьці на акр. РСІ сумесна з гарсаветамі.)

3. У практыку ўстаноў, абслугоўваючых патрэбы і запросы шырокіх мас сялянства (АВК, пракуратура, земорганы, сабес і інш.), увесьці пасылку адказных прадстаўнікоў у вёску, як для прыёму там заяў ад сялян, так і магчымага разьвязваньня шэрагу спраў на мейсцы. Акрвыканкомам даручыць распрацоўку пытаньня аб нарадках, тэрмінах і месцах выезду, спосабах апавяшчэньня насельніцтва і інш.

4. Ва ўсіх без выключэньня ўстановах напісьменным і малапісьменным наведвальнікам павінна ў абавязковым парадку аказвацца пісьмовая дапамога па справах, якія праходзяць праз гэтую ўстанову. Для гэтага з апарату выдзяляецца неабходная колькасьць працаўнікоў, якія абавязаны ў любы рабочы час пісаць наведвальніку тое, што патрабуе пісьмовага выкладаньня.

5. Таксама ва ўсіх установах на тую асобу, на якую будзе ўскладзен абавязак аказаньня пісьмовай дапамогі наведвальніку, укладзецца абавязак выдачы наведвальнікам усялякага роду справак арганізацыйнага характару (аб парадку і часе прыёму ў установе, аб асабовым складзе працаўнікоў, аб разьмяшчэньні пакояў, аб функцыях аддзелаў, частак інспекцый і інш.).

6. Установы, дзе ўводзяцца прадстаўнікі насрэдбюро, абавязаны дармова прадставіць апошнім выгодзе для работы і для зваротку наведвальнікаў памяшканьне і абстаноўку (мэбля) для работы. Тыя ўстановы, у якіх арганізуецца работа прадстаўнікоў насрэдбюро, аслабяюцца ад абавязковай арганізацыі справачнай работы і аказаньня пісьмовай дапамогі наведвальнікам праз сваіх працаўнікоў.

7. Усім установам пры ўваходах у памяшканьне зьмясьціць аб'явы (дошкі) з дакладным і ясным указаньнем разьмеркаваньня пакояў (аддзелаў ці частак), нарадку і часу прыёму наведвальнікаў, аказаньня пісьмовай дапамогі, месца выдачы справак. Форму такіх аб'яў, тэкст іх і месца разьмяшчэньня абавязкова правесьці праз Эканомкамісіі.

8. Калі ўваходу ў кожны пакой павінны быць вывешаны сьпісы працуючых у гэтым пакоі асоб (ці озьвічнай) з паказаньнем іх пасад.

9. Абавязаць кіраўнікоў усіх устаноў завесьці ў сябе гэткі парадак, каб:

а) на час адсутнічаньня в установы любога працаўніка на час больш гадзіны заставалася замяшчаючая яго асоба, якая павінна мець права і быць абавязана (у межах правоў замяшчаючага) самастойна разьвязваць усе пытаньні асабіста зьвяртаючыхся наведвальнікаў;

б) У выпадку асабістага зваротку наведвальніка з працоўных да кожнага працаўніка, апошні абавязан неадкладна яго прыняць, не затрымліваючы прыём ніякай службовай работай (разглядам перапіскі, гутарка з падпарадкаваным працаўніком ці з іншай асобай на службовай справе і т п.). На час-жа пасяджэньняў павінен вылучацца намесьнік для прыёму наведвальнікаў.

10. Ва ўсіх установах увесьці скрынкі для заяў ці кнігі скаргаў, месца знаходжаньне якіх павінна быць самае выгоднае для наведвальнікаў (устанавіць Эканомкамісіі суадносна-ведамай установы).

11. Вынікі разбору скаргаў на грубасьць і пяганіну абавязкова павінны быць даведзены да ведама шырокіх мас (паведамленьне на сходах, апублікаваньне ў друку, насьценгазеце, вывешваньне пратаколу на відным месцы і г. д.).

12. Растлумачыць установам, што анонімныя скаргі, якія закранаюць канкрэтныя давіны (асоб, пэўныя факты), павінны атрымоўваць гэткі-ж рух, як і скаргі з подпісамі, бо падпісаньне скаргаў толькі палягчае часам высьвятленьне акалічнасьцяў, а вусім ня робіць іх адзіна законнымі для разбору.

13. Абавязаць кіраўнікоў усіх устаноў забясьпечыць памяшканьні, дзе наведвальнікі чакаюць прыёму, дастатковай колькасьці мэблі для сядзеньня наведвальнікаў, а таксама стварыць адпаведную абстаноўку наогул (цяпло, сьвятло і г. д.).

14. У выпадку асабістага зваротку, а таксама, калі ў заяве маецца аб гэтым просьба,—наведвальніку павінен быць указан тэрмін выкананьня яго справы; у тых выпадках, калі рашэньне пытаньня патрабуе руху толькі ў апараце данай установы (на пасяджэньні камісіі, калегіі, прэзыдыуму, праз азнаямленьне кіраўніка і г. д.),—тэрмін павінен указвацца дакладны; калі справа патрабуе справак, тлумачэньняў і інш. ад іншых устаноў, тэрмін паказваецца дапасавана да часу, які патрэбен на атрыманьне гэтых даных.

15. Пры перадачы спраў асабістага характару для выкананьня ў кожным паасобным выпадку павінны прызначацца дакладныя тэрміны выкананьня, парушэньне якіх павінна цягнуць прыняцьце мер узьдзейнічаньня.

16. Абавязаць усе органы і ўстановы і ўсіх службовых асоб усе вядомыя ім выпадкі заціжкі асабістых спраў працоўных (дача тлумачэньняў, прысылка справак, разгляд справы па сутнасьці і інш.) в боку іншых устаноў і асоб даводзіць да ведама вышэйстаячых (у адносінах вінаватых) інстанцый для прыняцьця мер узьдзеяньчаньня, прычым замоўчваньне вядомых выпадкаў заціжкі таксама павінна цягнуць спагнаньне з боку органаў РСІ ці вышэйстаячых ведамсьцьвенных інстанцый (як і сама заціжка).

17. Усе паступаючыя ў установы заявы, хадайніцтвы, скаргі і інш., калі па іх ня прымаецца рашэньне тут-жа павінны перасылацца непасрэдна ў той орган, ад якога залежыць прыняцьце рашэньня ці дача заключэньняў вышэйстаячым органам.

Перасылка заяў па ўсяму раду наступных інстанцый (прыкладна: ЦВК-АВК-АФА-РВК, ці НКЗем-АЗА-РВК і т. п.) павінна быць зьнічана.

18. Даручыць кіраўнікам устаноў, разам з эканомкамісіямі, пераглядзець сыстэму руху заяў унутры апарату ў бок большага спрашчэньня і пакарачэньня праходжаньня дапасавана да ўмоў работы данай установы і на падставе існуючых правіл відзеньня справаводзтва.

19. Забараніць усім установам патрабаваць далатковага завяраньня РВК рознага роду даведак фактычнай якасьці выдадзеных сельсаветамі (аб маемасным стане, сямейным складзе, фактах падажу скаціны і інш.), бо сельсаветы і зьяўляюцца тымі законнымі органамі, на якія і ўскладзена выдача рознага роду даведак.

20. Абавязаць кіраўнікоў усіх цэнтральных устаноў у месячны тэрмін скласьці кароткі, але ясны і зразумелы пералік тых патрабаваньняў, якія прадъяўляюцца прасіцелю пры зваротку яго ў адпаведны орган па таму ці іншаму пытаньню: якія дакументы (даведкі, пасьведчаньні, акладныя лісты, сьпісы і інш.) абавязкова патрэбна прадставіць; дзе іх атрымаць; куды мэтазгодней усяго адразу зьвяртацца з просьбай ці хадайніцтвам (у сельсавет, у раённыя ўстановы, у акруговы і г. д.).

Пры распрацоўцы гэтых указаньняў установам неабходна ўлічыць магчымасьць і мэтазгоднасьць увядзеньня ў практыку такога правіла, што акладныя лісты на падатку зьяўляюцца адзіным і дастатковым дакументам на палому шэрагу пытаньняў замест шматлікіх паасобных даведак аб маемасным, сямейным ці сацыяльным становішчы,—накшталт таго, як службовае пасьведчаньне ці прафбілет зьяўляюцца дастатковым дакументам па шэрагу асабістых пратэзій рабочых і служачых.

Праэкты гэткіх паказаньняў установы прадстаўляюць у НК РСІ. Па ўзгадненьні праэктаў усіх ведамстваў мець суджэньне, ці неабходна выдаць указаньні ўсіх ведамстваў у выглядзе агульнага даведніка для рассылкі на месца (сельсаветам, хатам-чытальням, клюбам і інш.), ці абмежавацца рассылкай паасобных (ведамственых) даведвальнікаў.

21. Абавязаць кіраўнікоў устаноў разам з прафарганізацыямі ў бліжэйшы час правесьці сярод працаўнікоў устаноў самае дэтальнае асьвятленьне пытаньня аб зваротку в наведвальнікамі і іх абслугоўваньні. У далейшым прымаць самыя суровыя меры ўзьдзейнічаньня ў адносінах да тых працаўнікоў, якія будуць дапускаць грубасьць ці няўважлівасьць у зваротку, ня будуць ясна і поўна, у межах сваёй кампэтэнцыі, паведамляць наведвальніка пры кожным звароткі; будуць затрымоўваць прыём наведвальніка і будуць дапускаць заціжку разбору тага ці іншага пытаньня наведвальніка і інш.

22. Заг. ЦРА абавязаць дзяжурных урачоў па хуткай дапамозе, калі яны ад'яжджаюць (асабліва ўночы) да пацыентаў у горад, накідаць у дзяжурным пакоі паказаньні, к якому часу зьвернуцца яны ў амбуляторыю, каб тым, што зьвяртаюцца ў хуткую дапамогу ўначы, ведалі, у які час можна застаць дзяжурнага ўрача. Таксама пры запісу наведваньняў на дому паказваць час (прыблізна) наведваньня ўрачом хворага на дому.

23. Абавязаць органы аховы здароўя навесьці самую рашучую барацьбу са спазьненьнямі ўрачэбнага і службовага пэрсаналу амбуляторый. Па кожнаму паасобнаму выпадку спазьненьня неадкладна прымаць меры ўзьдзейнічаньня і зьнішчэньня з паведамленьнем шырокіх мас працоўных аб прынятых мерах.

24. Так як дазвол на ўход урачоў в прыёму ранейшы вызначанага тэрміну—хоць бы і на выкананьні нормы прыёму—стварае фармальна законную магчымасьць нагаршаць якасьць работы ўрача за лік эканоміі асабістага часу, прапанаваць органам аховы здароўя адміністыць усе існуючыя да гэтых пор выключэньні.

25. Накіраваньне на кансультацыю, а таксама запрашэньне кансультантаў і кансіліумаў на дом вытвараць выключна праз першага ўрача, які лячыў гэтага хворага. Аплату кансультацый і кансіліумаў, скліканых апрача ўрача, які раней лячыў, в сродкаў аховы здароўя забараніць.

Увага: усякія паасобныя выпадкі выключэньняў з гэтага правіла, павінны быць афіцыйна праведзены праз загадчыкаў амбуляторый пад іх адказнасьць.

Нам. Наркома РСІ БССР Элькінд.

# Як праходзіць двухтыднёвік ашчаднасьці.

## У камісіі прэзыдыуму ЦВК БССР садзейнічаньня двухтыднёвіку ашчаднасьці.

27 лютага г. г. пад старшынствам тав. **Хацковіча** адбылося пасяджэньне камісіі прэзыдыуму ЦВК садзейнічаньня двухтыднёвіку ашчаднасьці.

На гэтым пасяджэньні быў заслухан даклад загадчыка цэнтральнай касы ашчаднасьці тав. Падольскага аб ходзе ў БССР кампаніі па зьбіраньні ашчадаў. Падрыхтоўчая праца на мясцох разгорнута досыць шырока, некаторыя акругі ўжо прыступілі да практычнай працы. Добра пастаўлена праца ў Бабруйскай акрузе, дзе за час з 1-га па 25 лютага ўцягнута новых 3000 укладчыкаў з агульнай сумай укладаў у 132.000 р. У астатніх акругах, дзе ўжо пачаўся двухтыднёвік (Ворша, Віцебск, Магілеў) слаба праходзіць практычная праца, асабліва на вёсцы.

Цэнтральнай касай ашчаднасьці праведзена 5 гутарак праз радыё-станцыю; на месцы разасланы лёзунгі; у бліжэйшыя дні будзе распаўсюджана кіно-хроніка, прысьвечаная двухтыднёвіку ашчаднасьці.

Цэнтральная камісія пастанавіла зьвярнуць увагу акруговых выканаўчых камітэтаў на прыняцьце неабходных мер да ўцягненьня ў касы ашчаднасьці выберажэньняў насельніцтва, асабліва ў вёсцы. Камісія таксама зьвярнулася з просьбай да ЦСПСБ аб прыняцьці з яго боку неабходных мер да разгортваньня кампаніі ў горадзе сярод рабочых і служачых.

У больш адсталыя акругі будуць камандыраваны члены цэнтральнай камісіі.

## НА ЦАГЕЛЬНІ „ТОРГСТРОЯ".

Агульны сход рабочых і служачых цагельні «Торгстроя», заслухаўшы даклад прадстаўніка Галоўнай Касы Ашчаднасьці аб значэньні двухтыднёвіка ашчаднасьці, пастанавіў:

Захаваньне сродкаў у касе ашчаднасьці палягчае становішча рабочых і служачых і дапамагае больш рацыянальнаму выдаткаваньню заработку.

Усе 100 проц. рабочых і служачых заводу ўступаюць укладчыкамі касы.

Арганізаваць на заводзе пераклічку паміж рабочымі і служачымі.

Выклікаць спаборніцтва рабочых і служачых цагельні „Торгстроя".

## НА ЗАВОДЗЕ „КРАСНАЯ ЗАРЯ".

На агульным сходзе ячэйкі КП(б)Б заводу «Красная Заря», пасьля заслуханьня дакладу прадстаўніка Галоўнае Ашчаднае Касы аб працы кас ашчаднасьці і значэньні двухтыднёвіка ашчаднасьці, пастаноўлена:

Усім партыйцам і камсамольцам стаць укладчыкамі касы ашчаднасьці і стала ёю карыстацца.

У бліжэйшыя дні склікаць агульны сход рабочых і служачых заводу, на якім паставіць пытаньне аб двухтыднёвіку ашчаднасьці.

Дамагчыся ўцягненьня да 15-ІІ—100 проц. рабочых і служачых у касу ашчаднасьці.

Прысьвеціць спэцыяльны нумар сьценгазэты двухтыднёвіку ашчаднасьці і працы касы ашчаднасьці на заводзе. Газэту выдаць не пазьней 5-га сакавіка г. г.

Даручыць Бюро ячэйкі КП(б)Б і ЛКСМ вылучыць актывістаў для вярбоўкі ўкладчыкаў на заводзе.

Даручыць бюро шофтаварыства ў плян сваёй працы ўключыць папулярызацыю ашчаднае справы, дзеля чаго выкарыстаць усе выезды ў падшэфную вёску.

Пэрыядычна заслухоўваць даклады аб працы касы ашчаднасьці на заводзе і прымаць меры да яе ўзмацненьня.

# ХРОНІКА.

## У Прэзыдыуме Менскага акрвыканкому.

### Рост малочнай і жывёлаводнай каапэрацыі.

Прэзыдыум Менскага акрвыканкому зацьвердзіў вытворчы плян акруговага малочна-жывёлаводнага саюзу на 1928-29 г.

Паводле пляну сёлета колькасьць пайшчыкаў будзе павялічана да 12.800 чал. і колькасьць кароў у таварыствах—да 22000 галоў. Будзе сёлета арганізавана 21 новае таварыства і пашыраны існуючыя. Мяркуецца на ўсіх таварыствах сабрань 9105 тон малака, што ў параўнаньні з леташнім дасьць павялічэньне на 68 проц.

Пайшчыкам за год будзе аплочана 7200 тон канцентраваных кармоў, 150 галоў гатункавых кароў, а калгасам—500 кароў. Мяркуецца таксама пры таварыствах арганізаваць 787 злучных пунктаў.

### З самаабкладаньнем сьпяць.

Згодна вестак на 22 лютага, на Менскай акрузе самаабкладаньне прынята сходамі на суму 275867 руб., што складае толькі 12,4 проц. ад сумы сельска-гаспадарчага падатку.

Асабліва кепска стаіць справа з правядзеньнем кампаніі па самаабкладаньню ў Капыльскім, Плешчаніцкім і Чэрвенскім раёнах, дзе прынятая сходамі сума не перавышае 6 проц. падатку.

Не зважаючы на дырэктывы аб скарачэньні правядзеньня сходаў да 15 лютага, дагэтуль сялянскія сходы на ўсюды праведзены, а ў шмат якіх вёсках ня зроблена яшчэ раскладкі прынятага самаабкладаньня сярод сялян. Дагэтуль па ўсёй акрузе сабрана па самаабкладаньню 1312 руб.

Між тым, факты сьведчаць, што сёлета сялянства да самаабкладаньня адносіцца куды лепш, чым летась.

Прэзыдыум акрвыканкому катэгарычна запрапанаваў усім райвыканкомам, асабліва Плешчаніцкаму, Капыльскаму і Чэрвенскаму, тэрмінова правесьці сходы, дзе яны яшчэ не праводзіліся, і зараз-жа распачаць вбор прынятых сум.

### Вынаходцу Штэрну выдадзена прэмія 300 руб.

Працаўнік менскага халадзільніка тав. Штэрн зрабіў вынаходку, якая ўжо прымяняецца на халадзільніку і дала 30.000 рублёў эканоміі. Тав. Штэрн зрабіў крук-рычаг для падвескі і перамяшчэньня мясных туш.

Прэзыдыум Менскага акрвыканкому пастанавіў выдаць т. Штэрну за гэту вынаходку прэмію ў 300 руб.

## Што атрымала сялянства па юбілейнаму маніфэсту ЦВК БССР.

Прэзыдыум Менскага Акрвыканкому заслухаў даклад аб выніках ажыцьцяўленьня маніфэсту юбілейнай сэсіі ЦВК БССР.

У выкананьне маніфэсту каапэравана інвалідаў вайны ў арцелі інвалідаў—35—40 чалавек; за гэты час арганізаваны 4 новыя арцелі з інвалідаў. Колькасьць інвалідаў вайны, якія атрымоўваюць пэнсію, за год павялічылася з 380 да 482 чал. Па адміністрацыйнаму аддзелу зьнята штрафаў на суму 68877 руб. Апрача таго, вызвалена ад адбыцьця прымусовых работ 1715 чалавек і спынена 391 справа.

Па Менскаму аддзяленьню Белсельбанку сьпісана пазык з 103 бядняцкіх гаспадарак, якія пацярпелі ад стыхійных няшчасьцяў, 4558 руб.

Дзярмстрах зьняў па Менскай акрузе нядоімкі з 9572 гаспадарак на суму 16438 руб.

Асабліва значную дапамогу па маніфэсту атрымала сялянства акругі па сельска-гаспадарчаму падатку. Так, у 1927-28 г. поўнасьцю і часткова вызвалены ад сельска-гаспадарчага падатку 48604 гаспадарні або 37,7 проц. усіх гаспадарак Меншчыны на суму 227241 руб. Апрача таго, зьнята нядоімкі мінулых гадоў 23306 руб.

Менскім акруговым судом па маніфэсту спынена 395 крымінальна-касацыйных спраў у адносінах да 602 чал. і вызвалена ад адбываньня кары 242 чал. Нарсудамі акругі спынена 7445 спраў і вызвалена ад кары па 3386 справах 4026 чалавек.

## Падрыхтоўка кваліфікаваных рабочых.

На пасяджэньні прэзыдыуму ВСНГ Бел. было абгаворана пытаньне аб падрыхтоўцы кваліфікаванай рабочай сілы. Трэстам запрапанавана палепшыць пастаноўку справы як фабзавуча, так і навучаньня ў парадку індывідуальна-брыгаднага вучнёўства.

У бліжэйшым часе на больш буйных прадпрыёмствах адчыняецца 13 прафтэхнічных курсаў для рабочай моладзі. Гэтымі курсамі будзе ахоплена па БССР каля 350 чалавек. Апрача таго, зьвернута ўвага на палепшэньне пастаноўкі навучаньня ў прафшколах і на курсах ЦПІ. Менскім курсам ЦПІ неабходна тэрмінова вывучыць мэтадалёгію падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых шэйнікаў і тэкстыльшчыкаў. Рабочых гэтай спэцыяльнасьці наша прамысловасьць патрабуе вялікую колькасьць. Напрыклад, на шэйнай прамысловасьці ў працягу бягучага і наступнага гадоў патрабуецца да 2000 новых рабочых-шэйнікаў.

У чэрвені месяцы ВСНГ Бел. скліча ўсебеларускую нараду прадстаўнікоў гаспадарчых органаў з удзелам зацікаўленых ведамстваў і арганізацый для абгаварэньня пытаньня прафсьветы ў БССР

## Кантрактацыя студэнтаў.

Прэзыдыум ВСНГ Бел. заслухаў даклад аб выніках кантрактацыі студэнтаў-спэцыялістаў з Вышэйшых Тэхнічных Навуковых Устаноў у саюзных рэспубліках.

Прэзыдыум канстатаваў, што маскоўскае і ленінградзкае студэнцкія зямляцтвы не аддалі належнай увагі кантрактацыі студэнтаў. Даручана групе ВСНГ эканомісі праці закантрактаваць сёлета для прамысловасьці ВСНГБел. 60 студэнтаў па розных спэцыяльнасьцях.

## Новыя школы фабзавуча.

У бліжэйшыя дні на менскім скуранным заводзе адчыняецца школа фабзавуча для падрыхтоўкі з рабочай моладзі кваліфікаванай рабочай сілы. У фабзавучы будзе навучацца 25 чалавек.

Будзе таксама сёлета адчынена школа фабзавуча мэталістаў у Віцебску і будаўнікоў у Менску. У Менску-ж будзе адчынена школа фабзавуча для падрыхтоўкі кваліфікаванай рабочай сілы для шэйкай прамысловасьці.

## КУЛЬТУРНЫЯ НАВІНЫ.

### Вывучэньне райёнаў БССР.

З вясны сёлетняга году ЦБ краязнаўства арганізуе сталае вывучэньне 3-х раёнаў: Камарынскага і Чэчэрскага раёнаў (Гомельскай акругі) і Чырвона-Слабодзкага раёну (Бабруйска е акругі).

Вывучэньне будзе праводзіцца мясцовымі краязнаўцамі пад кіраўніцтвам і пры дапамозе інструктароў в ЦБ Краязнаўства

### Цікавыя экспанаты па энтамо-,', дэгіі.

Беларускі Вэтэрынарны Інстытут сабраў у сваім музэі надзвычайна багатыя калекцыі па энтамалёгіі. У музэі інстытуту зараз знаходзіцца 14.000 розных эўрапейскіх і азіяцкіх жукоў і 8000 розных жукоў, сабраных на абшарах БССР.

Усяго ў музэі інстытуту сабрана 2517 розных экспанатаў і калекцый.

Апроч гэтага, пры інстытуце знаходзіцца багаты батанічны сад і анатамічны музэй.

## Каго больш мэтазгодна перасяліць?

(Бел. Дзярж. Унівэрсытэт).

З пашырэньнем працы Беларускай Акадэміі Навук пашыраецца і патрэбы ў памяшканьні. Часова вастанавіліся на студэнцкім інтэрнаце і, як на вло, як раз цяпер, зімой, у самым разгары заняткаў. Але нічога на зробіш! Акадэміі патрэбна, і мы перасяляем з інтэрнату ў былы дом селяніне па Ленінградзкай вуліцы 120 студэнтаў.

Каго выселяць? мэдфак, пэдфак ці праўгас? І вось выканбюро чамусьці вырашыла выселіць мэдфак. Пытаньне ўскладняецца.

Дзе мэтазгоднасьць? Каля інтэрнату па Ленінскай знаходзіцца 1-ая сав. больніца, анатамічны тэатр, дзіцячая клініка. І амаль што ўсе студэнты мэдфаку штодзённа наведваюць гэтыя лячэбныя і вучэбныя ўстановы. Між тым, як будынак пэдфаку і праўгасу як раз знаходзіцца каля дому селяніна па Ленінградзкай вуліцы.

Здаецца, было карысным было-б перасяліць ці пэдфак, ці праўгас, толькі ня мэдфак, бо ў апошнім выпадку і адны і другія былі-б здаволены.

Мэдфак, які і так вельмі перагружан працай, які і так вельмі часта бяжыць в аднаго канца гораду ў другі на заняткі, нельга цяпер ні ў якім разе перасяляць.

Праўленьню ун-ту неабходна тэрмінова вырашыць гэта пытаньне.

Сымон.

## Што слухаць па радыё.

ПЯТНІЦА, 1 САКАВІКА.

17-30—17-55 Час акцябрат.
17-55—18-15 Інфармацыя СНК БССР.
18-15—18-35 Музычны адлачынак.
18-35—19-25 Лекцыя рабоча-сялянскага радыёўнівэрсытэта (падрыхтоўчага курсу) па мове і літаратуры Беларусі.
19-25—20-15 Беларуская радыёгазэта.
20-15—20-40 Лекцыя з цыклю: «Гігіена працы».
20-50—23-00 Канцэрт.

# СУД.

## Хуліганы-антысэміты з гарбарні „Бальшавік"*).

Другі дзень разьбіраецца справа хуліганаў-антысэмітаў, але цікавасьць да працэсу не памяншэлася.

Суд дапытвае пацярпеўшага т. Столяра. Сьведка ўносіць новыя дэталі гэтае жудаснае справы. Спачатку сьведка хвалюецца. Успаміны аб нечалавечай крыўдзе в боку яго таварышоў на працы перамагаюць стрыманасьць гэтага спакойнага, малагаворкага чалавека, і ён апавядае падрабязна ўсю сутнасьць гэтае справы.

Ганчарык меў уплыў на Якутовіча і Тарасковіча. Ганчарык любіў кпіць з сьведкі; часта перад грамадой рабочых Ганчарык брыдка гаварыў пра сям'ю Столяра.

Пераходзячы да самага факту пуску вапны ў чоп, калі там быў сьведка, Столяр гаворыць, што Ганчарык загадаў гэта зрабіць, пры чым Ганчарык пусьціў раней у чоп вапну, а звычайна ў чоп пускаюць спачатку ваду, а пасьля ўжо вапну. Калі ў чоп пусьцілі гарачую вапну, дык падняўся такі пыл, што пацярпеўшы ледзь патраціў уцячы.

Сьведка Савіцкі сьцьвярджае, што бачыў на адзежы Столяра плямы ад вапны, калі апошні вылазіў з чопа. Пры гэтым Ганчарык сьмяяўся в Столяра.

Сьведка Барадо паказвае суду, што Ганчарык быў мала-дысцыпліраваным рабочым і наогул дрэнна працаваў. Яўрэям Ганчарык стараўся накідаць цяжкую працу, а сабе і сваім таварышам выбіраў лёгкую.

Наогул, усе сьведкі сьцьвярджаюць, што Ганчарык быў першым бузацёрам на заводзе. Гэта быў першы канавод ва ўсялякіх склоках і спрэчках. Сваю працу і сваю асобу Ганчарык цаніў вышэй усяго і ўсіх.

Вельмі характэрнымі тыпамі трусьліваго мяшчанства зьяўляюцца сьведкі Аляшкевіч і майстра Трускін, якія імкнуцца на судзе ўсяляк адкараскацца ад сваіх папярэдніх паказаньняў. Зусім слушна, што гета ёсьць уплыў радні Ганчарыка і іншых падсудных. Жонка Ганчарыка тут-жа сядзіць і ня можа ўстрымацца ад рэплік, калі Ганчарык дае суду свае паказаньні.

Каб скрыць сваю блытаніну ў паказаньнях, Аляшкевіч спасылаецца чамусьці на сваю малаграматнасьць. На запытаньне суду, што за чалавек Ганчарык, Трускін лёканічна адказвае: „так сабе". Але пракурор шэрагам пытаньняў прымушае яго даць поўную і належную характарыстыку Ганчарыка. У майстры Трускіна слова „так сабе" азначае хуліганіц, буяніц і г. д. Гэтыя характэрныя фігуры мяшчанскага балота, якія глядзяць на ўсё скрозь руховыя акуляры і в усімі імкнуцца жыць у згодзе. Для іх і хуліган, і антысэміт зьяўляюцца добрымі таварышамі. За чарку гарэлкі яны гатовы вымяніць свае паказаньні.

Усё-ж Аляшкевіч і Трускін мусілі на судзе згадзіцца, што Ганчарык зьяўляецца антысэмітам і хуліганам.

*) Гл. „Сав. Бел. № 46.

## Новыя кнігі.

Паступілі ў рэдакцыю газэты «Савецкая Беларусь» для рэцэнзіі наступныя часопісі і кнігі:

1. „Чэрвоны шлях" № 1 за 1929 год. Грамадзка-палітычны і літаратурна-навуковы журнал. Стар. 296, цана 1 руб. 80 к. Дзяржаўнага Выдавецтва Украіны.

«Революция и культура» № 3, за 29 г. Стар. 80, цана 50 кап. Выдавецтва газэты „Правда". Масква.

3. «Дзейнасьць Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі КП(б)Б». Да справаздачы на XII-м зьезьдзе КП(б)Б. Выданьне ЦК КП(б)Б Менск.

# ВЫБІРАЕМ У ГАРСАВЕТ ЛЕПШЫХ.

## У Менску трэба пабудаваць стадыён.

(На сходзе скуранікаў прыватных прадпрыёмстваў).

З 170 членаў саюзу скурнікаў прыватных прадпрыёмстваў на сход зьявілася толькі 130. Гэта тлумачыцца тым, што працуюць рабочыя ў невялічкіх прадпрыёмствах, якія расьцярушаны па ўсяму гораду.

Пасьля зачытаньня наказу выступіла 12 чалавек. Пераважна накіроўвалі ўвагу на жыльлёвыя недахопы.

Выступаўшыя таварышы ўнесьлі новы пункт—аб пабудове фізкультурнага стадыёну, бо бяз добрага стадыёну нельга належна разгарнуць фізкультурнае выхаваньне.

Дэпутатам гарсавету абраны беспартыйны рабочы тав. Ліхадзіеўскі, кандыдатам—рабочы тав. Чэрніна (кандыдат партыі).

## Зьнішчым вулічную бяспрытульнасьць.

(На сходзе студэнцтва і настаўніцтва яўрэйскага пэдтэхнікуму).

Шумнай хваляй запоўніла залю студэнцтва і настаўніцтва яўрэйскага педагагічнага тэхнікуму. Без адняжкі прыступаюць да абгаварэньня наказу і выбараў кандыдатаў.

Усяго зьявілася на сход 64 проц. складу студэнцтва, бо рэшта знаходзіцца ў месцачковых школах на пэдагагічным стажы.

Гарачымі нападкамі атакаваў сход вулічную бяспрытульнасьць. Сход пастанавіў даручыць дэпутатам новага складу гарсавету навесьці рашучую барацьбу з гэтым злом. На вуліцах Менску не павінна быць бяспрытульных, за гэту справу трэба ўзяцца рашуча і сур'ёзна.

Дэпутатам у гарсавет сход абраў члена КП(б)Б тав. Големштока, кандыдатам—студэнта тав. Медніка.

# БІБЛІАГРАФІЯ.

## ЗАПАДНАЯ БЕЛОРУССИЯ НА СКАМЬЕ ПОДСУДИМЫХ. ПРОЦЕСС БЕЛОРУССКОЙ КРЕСТЬЯНСКО-РАБОЧЕЙ ГРОМАДЫ.

Белгосиздат. Минск, 1929. Стр. 261. Цана 1 р. 50 кап.

Толькі што выйшла з друку і паступіла ў продаж новая кніжка пад назвай: «Западная Белоруссия на скамье подсудимых. Процесс „Белорусской Крестьянско-Рабочей Громады». Кніжка выйшла пакуль што на расейскай мове, але гэтымі днямі яна зьявіцца і на беларускай.

Як паказвае назва, кніжка ўключае ў сабе матар'ялы аб «Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамадзе"—нарысы аб гісторыі ўзьнікаваньня, разьвіцьця, дзейнасьці і аб самым працэсе над „Грамадою".

Пасьля вядомых ужо нам інтэрпяляцый, у якіх сабраны інтэрпяляцыі і прапазіцыі беларускіх паслоў з „Беларускага Пасольскага клюбу" і в «Клюбу паслоў Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады», зборнік артыкулаў і дакумэнтаў аб «Грамадзе» і аб працэсе над ёю зьяўляецца вельмі кантоўным дапаўненьнем, абхапляючы сабою наступныя фазы рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, які вышаў ужо в вузкіх соймавых рамак на шлях масавых і арганізаваных выступленьняў шырокіх народных гушчаў.

Пасьля кароткай прадмовы аб мэтах выданьня памянёнай кніжкі першым ідзе ў кніжцы артыкул С.Б. Традыцыі: «По стопам Романовых», дзе аўтар у форме жывых нарысаў абмалёўвае жыцьцё Зах. Беларусі пад уладай панскай Польшчы і дае кароткую гісторыю ўзьнікаваньня і вялізарнага посьпеху дзейнасьці «Вел. Сялянска-Работніцкай Грамады», дзейнасьці, якой стрэмяна спалохаліся польскія абшарнікі і польскі фашыскі ўрад і павялі в ёю правакацыйную барацьбу.

Далей ідзе артыкул Язэпа Паўлоўскага пад назвай: «На процессе». Артыкул разьбіваецца на некалькі частак. У першай в іх пад назвай „Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада", як і ў артыкуле Традыцыі, абмалёўваецца сітуацыя З. Беларусі пад уладай Польшчы і гісторыя ўзьнікненьня і дзейнасьці «Грамады». Па сутнасьці можна было-б абысьціся бяз гэтага артыкулу, аднак, з прычыны таго, што Паўлоўскі быў навочным сьведкаю працэсу „Грамады" і таму мог больш углыбіцца ў сутнасьць працэсу і ня толькі працэсу, а і ўсе справы «Грамады» і рэвалюцыйнага руху ў Зах. Беларусі, яго нарыс набывае асаблівую вагу і не зьяўляецца лішнім.

Наступны нарыс Я. Паўлоўскага пад назвай: «На процессе»—дае нам шэраг уражаньняў аўтара ад першых момантаў працэсу, пасьля чаго ў нарысе: «Западная Белоруссия на скамье подсудимых» аўтар так падагульвае свае ўражаньні ад працэсу:

«Достаточно посидеть хоть несколько дней на процессе, чтобы убедиться, что на скамье подсудимых не только депутаты Тарашкевич, Рак-Михайловский, Волошин, Метла и с ними 52 других гоотударственных «преступника», а вся нация, два с половиной миллиона